ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -адгку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
» абвестак	7-81

СУБОТА, 8 лютага 1930 г.

№ 32 (3540)

Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

По Савецкім Саюзе

АБЕЖНІК НАМ. НАРКОМА РСІ СССР

Аб правядзеньні пасеўнае кампаніі

МАСКВА. Нам. Наркома РСІ СССР тав. Акулаў паслаў усім мясцовым РСІ абежнік, у якім прапануе органам РСІ узмацніць нагляд за падрыхтоўкаю да правядзеньня пасеўнае кампаніі і, асабліва, за арганізацыяй ссыпкі насенных фондаў.

Пры выяўленьні здарэньняў слабое падрыхтоўкі з боку паасобных органаў і невыкананьня ў тэрмін заданьня па ссыпцы насенных фондаў неадкладна прыцягваць да адказнасьці вінаватых, а ўстановы, якія ня выканаюць у тэрмін заданьня па ссыпцы насенных фондаў, падлягаюць па-за чарговай чыстцы.

Казацкая беднота ліквідуе кулацтва

УРУПІНСК, 7. Ва многіх хутарах акругі адбыліся батрацка-бядняцкія сходы. Сходы патрабуюць неадкладнага высяленьня кулакоў і іх сем'яў з канфіскацыяй маемасьці і перадачаю яго ў непадзельны капітал калгасаў. Ва Урупінскім раёне ў 85 кулацкіх гаспадарках канфіскавана быдла, с.-г. інвэнтар і дамы. Маемасьць перадана калгасам. У 353 кулацкіх гаспадарках у рахунак пагашэньня запазычанасьці забрана маемасьць, якая таксама перадаецца калгасам. Неабходна выселіць кулакоў з месц, дзе мы пачалі будаваць новае жыцьцё,—заяўляюць у адзін голас казакі акругі.

Урачыстае спатканьне хворых байцоў Далёка Усходняй арміі

МАСКВА. Паводле вестак Асоавіяхіму на паправу здароўя байцоў Асобае Далёка-Ўсходняй арміі па СССР сабрана ўжо больш 150.000 руб. Бесьпярэчнымна паступаюць заяўкі розных арганізацый, якія закупаюць імянныя койкі для байцоў Далёка-Ўсходняе арміі. 80 байцоў ужо прысланы на курорты і забясьпечаны падаркамі. 2-га лютага з Чыты вышаў спэцыяльны санітарны цягнік, у якім едуць звыш 400 байцоў Асобай далёка-Ўсходняй арміі. У дарозе рабочыя наладжваюць цягніку ўрачыстыя спатканьні. Маскоўскія прафсаюзы пастанавілі разьмясьціць за свой кошт на курортах 250 байцоў.

Лётарэя па прасоўваньні кнігі ў масы

МАСКВА. З дазволу Савету Народных Камісараў Саюзу т-ва барацьбы з алкагалізмам, з мэтаю прасоўваньня кнігі ў масы, арганізуе лётарэю. Усяго выпушчана 2.000.000 білетаў, коштам па 30 кап. кожны, на суму 600.000 руб. Выйгрышы будуць выданы кнігамі, прычым кожны ўдзельнік абавязкова атрымае на свой білет выйгрыш коштам ня менш 25 кап. Ёсьць выйгрышы і да 200 рублёў. Выйграўшы мае права атрымаць у любым магазыне дзяржвыдавецтва і Цэнтрасаюзу любыя кнігі па сваім выбары на суму выйгрышу.

Прыдаючы вялікае значэньне лётарэі МАК УсеЛКСМ узяў на сябе манапольнае права пашырыць па Маскве і вобласьці 750.000 білетаў. Усе савецкія, грамадзкія, партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі павінны прыняць самы актыўны ўдзел у распаўсюджваньні лётарэйных білетаў.

(РОСТА).

НОВАЯ АРМІЯ ЛЕНІНЦАЎ

МАСКВА. У сувязі з ленінскімі днямі па Маскоўскай вобласьці рабочымі падана 63.188 заяў аб уступленьні ў партыю. На ўсіх заводах і фабрыках, ва ўсіх установах Масквы 5-га лютага, пасьля работы, былі наладжаны вытворчыя мітынгі. Рабочыя і інжынэрна-тэхнічныя работнікі кожнага прадпрыемства на гэтых мітынгах падагулілі свой уклад у першы год пяцігодкі і пастанавілі сумесьнымі ўдзесяцяронымі намаганьнямі «выканаць і перавысіць прамфінплян другога году». Дэманстрацыя скончылася толькі а 8 гадзіне ўвечары і ахапіла каля 150.000 інжынэраў, тэхнікаў, вузаўцаў, рабочае молодзі і дарослых рабочых.

ТУЛА, 5. Рабочыя, інжынэры і тэхнікі цэмэнтнага электра-мэханічнага і чыгуначнага цэхаў, Краснагорскага мэталюргічнага заводу (Тульская акруга), падалі калектыўную заяву аб прыёме іх у партыю.

АДЧЫНІЎСЯ ДЗІЦЯЧЫ УНІВЭРСЫТЭТ

ЛЕНІНГРАД, 6. Адкрыўся дзіцячы універсытэт. Універсытэт складаецца з наступных аддзелаў: індустрыяльна-тэхнічнага, антырэлігійнага, інтэрнацыянальнага і новага быту. Ва універсытэт прынята 200 дзяцей. (РОСТА).

Контр-рэвалюцыйнае гняздо ў саборы

ТОМСК, 6. У новым саборы знойдзены сьцяг «Союза русского народа» і захаваныя каштоўнасьці. Група царкоўнікаў на чале са старастай вяла чорнасоценную работу сярод насельніцтва. Стараста запэўняў, што сьцяг «Союза русского народа» яшчэ прыдасца. Кіраўнікі групы царкоўнікаў арыштаваны. У іх кватэрах знойдзена выкрадзеная з царквы маемасьць, каштоўныя кнігі, на некалькі дзесяткаў тысяч рублёў царскіх і калчакаўскіх грошай, партрэты Мікалая II і Калчака і зброя.

Сёньня адбылася вялікая дэманстрацыя арганізаванага насельніцтва і вучняў, якая патрабавала зачыненьня царквы і ўзмацненьня барацьбы з рэлігіяй. (РОСТА).

ВАЖНАЯ ВЫНАХОДКА ПРАФ. МАКСІМАВА

ЛЕНІНГРАД, 4. Праф. Максімаў вынайшаў спосаб гадоўлі расьлін цалкам пры электрычным сьвятле. Расьліны пасьпяваюць на працягу 10 дзён і даюць магчымасьць канчаткова вызначыць, якое зерня выгадавана—азімае ці яравое.

Гэта вынаходка савецкага вучонага мае вялізарнае практычнае значэньне ў сельскай гаспадарцы.

ПРАМТАВАРЫ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

МАСКВА, 5. (Наш кар.). Усяго ў другім квартале Беларусь атрымае прамысловых тавараў на 11.499 тыс. рублёў. З гэтае сумы гарадзкому насельніцтву выдаецца тавараў на 6.766 тыс. рублёў, а сёлам—на 4.733 тыс. рублёў. У склад гэтых прамтавараў уваходзіць: тэкстыль—на 8.975 тыс. рублёў, скуратавары—на 613 тыс. рублёў, абутак—на 1.420 тыс. рублёў, мэталёвыя вырабы—на 295 тыс. руб. і ваконнае шкло—на 196 тыс. руб.

Паведамленьне ТАСС

У радзе загранічных газэт надрукавана паведамленьне тэлеграфных агэнцтваў «Рэйтэр» і «Стэфані» аб ні то 200, ні то 400, ні то нават, 500 морскіх афіцэраў нібы растраляных у студзені г.г. у СССР. Гэтае міфічнае паведамленьне «Рэйтэра» і «Стэфані», узмоцнена мусіраванае рэакцыйнай прэсай у Эўропе, прывяло ў рух рускія белагвардзейскія колы, якія пасьпяшылі «адслужыць» у радзе гарадоў (Рыга, Рэвэль, Парыж, Варшава, Гэльсінфорс, Лёндан) паніхіды «по убиенным», а на самой справе — па жывых і здаровых людзях. Паніхіда па жывых — вось апошняя мода рэакцыйных клёўнаў. Паводле вестак з пэўных крыніц, атрыманых ТАСС, чутка адносна расстрэлу морскіх афіцэраў зьяўляецца нікчэмнаю хлусьліваю выдумкаю, якая ня мае пад сабою ніякае падставы. (ТАСС).

Рэарганізацыя апарату УсеЛКСМ

МАСКВА, 5. Бюро ЦК УсеЛКСМ пастанавіла наступным чынам рэарганізаваць апарат УсеЛКСМ. Ствараецца масава-эканамічны аддзел і пры ім сельска-гаспадарчы сэктар, аддзел асьветы і быту а нацменсэктарам, аддзел прапаганды і тэарытычнае вучобы. «Оргаспред» рэарганізуецца ў арганізацыйна-інструктарскі аддзел, пры якім утвараецца савецка-каапэрацыйны сэктар і інфармацыйна-статыстычны сэктар. Апрача таго, застаюцца вайскова-фізкультурны аддзел, цэнтральнае бюро юных піянэраў і канфліктная камісія.

Надзвычай каштоўнае вынаходніцтва марынуецца

МАСКВА, 3. Савецкі інжынэр Капялюшнікаў вынайшаў арыгінальнае канструкцыі турбасьвідар (машына для сьвідравальных работ у нафтапрамысловасьці). У кастрычніку мінулага году турбасьвідар дэманстраваўся на нафтавай выстаўцы ў горадзе Толса (ПАЗШ, штат Аклагама). Турбасьвідар быў выпрабаваны ў вельмі цяжкіх умовах і даў дасканалыя вынікі. Мацыпаю вельмі зацікавіліся амэрыканскія нафтапрамыслоўцы. Ёсьць шмат прапаноў аб продажы вынаходніцтва. Каштоўнасьць машыны т. Капялюшнікава ў тым, што яна ў значнай меры паскарае і патаньне сьвідраваньне.

Ня гледзячы, аднак, на агульна-прызнаную вялікую каштоўнасьць вынаходніцтва інжынэра Капялюшнікава, прамысловая вытворчасьць турбасьвідара да гэтага часу ў нас не наладжана. Асобныя экзэмпляры машыны вырабляюцца ў майстэрнях у Баку, але майстэрні вельмі мала прыстасаваны і кепска абсталяваны для гэтае вытворчасьці.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

У ЛЮТЫМ ДАБІЦЦА ПЕРАЛОМУ

Біць па канкрэтных носьбітах зла, бязьлітасна караць за нядбайства, фармалізм, галавацяпства

У РАБОЦЕ НАШЫХ ПРАФСАЮЗАЎ УСЁ ЯШЧЭ ПАНУЮЦЬ СТАРЫЯ ТЭМПЫ

Трывожны сыгнал з фабрыкі „Дняпроўская мануфактура“

Прамфінплян сыстэматычна ня выконваецца

Рабочыя фабрыкі, адзначаючы рэальнасьць і магчымасьць выкананьня прамфінпляну, сыгналізуюць аб агідных адносінах адміністрацыі да вытворчасьці і няўменьні прафарганізацыі накіраваць энтузіязм рабочых мас на барацьбу з цяжкасьцямі

Адкрыты ліст ў рэдакцыю „Зьвязды“

«Правда» ад 25-га студзеня друкуе адозву ЦК УсеКП(б) аб выкананьні прамфінпляну. На гэтым пытаньні рэдкалегія насьценгазэты і група рабочых фабрыкі «Дняпроўская мануфактура» рашыла зьвярнуцца ў рэдак цыю газ. «Зьвязда» з наступным лістом.

Наша партыя і савецкая ўлада ў другім годзе пяцігодкі ставяць перад намі вялізарнейшыя задачы. Між тым цэлы рад прычын перашкаджае нам выканаць вытворчую праграму.

Вялікае недавыкананьне прамфінпляну 1928-29 г. (на 30 проц.), недавыкананьне кантрольных лічбаў пер шага кварталу бягучага гаспадарчага году—на 9 проц. і **адсутнасьць пералому ў рабоце другога кварталу,**—прымушае нас зьвярнуцца да вас з просьбай—вывучыць прычыны і недахопы, якія могуць нарэшце сарваць выкананьне прамфінпляну бягучага году і пяцігодкі па нашай фабрыцы.

Рад тэхнічных і вытворчых нарад і сходаў рабочых у сваіх рэзалюцыях адзначаюць рэальнасьць і магчымасьць выкананьня прамфінпляну фабрыкі, але агідныя адносіны адміністрацыі да вытворчасьці і няўменьне фабкому накіраваць энтузіязм рабочых па барацьбу з перашкодамі выкананьня пляну, давялі фабрыку да вышэйпаказанага становішча (недавыкананьне пляну па ўсіх паказальніках).

Цікава адзначыць, што супрацоўнікі газэты «Акцябр», якія абсьледвалі нашу фабрыку, пісалі аб усім, толькі не аб галоўным—аб выкананьні кантрольных лічбаў. Мы лічым гэта вялікім недахопам газэты «Акцябр».

Мы лічым патрэбным паказаць на некалькі галоўных прычын, якія перашкаджаюць у нашай рабоце.

1. Ня было выстарчальнай падрыхтоўкі да пераходу на трохзьменную работу і 7-мі гадзінны рабочы дзень (кваліфікаваная сіла рыхтавалася за некалькі дзён да пераходу на тры зьмены, абсталяваньне ня было своячасова пастаўлена і г. д.).

2. З уноў пастаўленых 114 варштатаў-аўтаматаў «Нортроп»—50 проц. бязьдзейнічае з-за адсутнасьці ткачоў і ўтка.

3. Рухавік, які пастаўлены ў сувязі з пераходам па тры зьмены, з прычыны зношанасьці, часта спыняе работу, што вельмі дрэнна адбіваецца па рабоце падрыхтоўчага цэху.

4. За апошні час фабрыка забясьпечваецца пражай дрэннай якасьці, што адбіваецца на прадукцыйнасьці працы і якасьці прадукцыі.

5. Пры папаўненьні фабрыкі рабочымі было прынята шмат інвалідаў, якія і па сёньняшні дзень не выпрацоўваюць нормы.

6. Падсобныя матар'ялы атрымліваюцца з вялікім спазьненьнем (пасьля 6-8 месячнай перапіскі) і вельмі дрэнай якасьці.

7. Закупленае абсталяваньне не выкарыстоўваецца (напрыклад, шліхтавальная машына, сушыльныя барабаны).

8. Купленая за межамі машына крыжовай моткі пасьля 2-х месячнай работы амаль вышла з строю.

Усе пералічаныя буйныя дэфэкты прымушаюць біць трывогу і прыняць у самы кароткі тэрмін рашучыя меры. Мы думаем, што газэта «Зьвязда» ўлічыць усё гэта і ў бліжэйшы час азнаёміцца з работай нашай фабрыкі.

Фабрыка «Дняпроўская мануфактура», Дуброўна, Аршанскай акругі.

Рэдкалегія і рабочыя:

С. Рабіновіч, Дрыбінскі, Юхвідзін, Гіноўкер, Шалун, Галавічэр, Шумейка.

Ад рэдакцыі: Учора рэдакцыя камандыравала на фабрыку «Дняпроўская мануфактура» свайго спэцыяльнага карэспандэнта для азнаямленьня са становішчам на фабрыцы і аказаньня дапамогі рабкорам у іх барацьбе за выкананьне прамфінпляну і пяцігодкі.

БЯЗ ЗЬМЕН

Менская гарбарня „Бальшавік“ за першы квартал недавыканала свайго прамфінпляну на 15,4 проц. Студзень сьведчыць аб тым, што заводзкія арганізацыі ня ўжылі рашучых мер для стварэньня пералому. У студзені гарбарня выпусьціла прадукцыі таксама на 15 проц. менш, чым вызначана плянам.

Г.

ВІНАВАТА АДМІНІСТРАЦЫЯ

Менская фабрыка абутку ў першым квартале недавыканала свайго прамфінпляну на 18 проц. Студзень даў некаторы пералом, але ўсё-ж менская фабрыка свой плян недавыканала на 5 проц. Трэба адзначыць, што ніякіх аб'ектыўных прычын для гэтага ня было. Фабрыка поўнасьцю забясьпечана сырцом. Усе варштаты—у поўным парадку. Адзіная прычына недавыкананьня прамфінпляну—**ня досыць сур'ёзныя адносіны да вытворчасьці адміністрацыі фабрыкі.**

С.

Зноў прагулы

НОВА-БАРЫСАЎ. З усіх прадпрыемстваў Нова-Барысава толькі завод «Камінтэрн» выканаў прамфінплян у першым квартале. Вытворчая праграма па лесапільным цэху выканана на 116 проц., прадукцыйнасьць працы перавыкананa на 9 проц. Вытворчая праграма фанэрнага цэху выканана на 107 проц., прадукцыйнасьць працы перавыкананa на 11 проц. Але дрэнна са зьніжэньнем сабекошту, якое недавыканана на 4 проц. Асноўная прычына—паломка нажа ў разальнай машыне, рамонт якога каштаваў каля 3.000 руб. Адмоўны ўплыў меў таксама і рост прагулаў.

ПРАФСАЮЗЫ ПА-РАНЕЙШАМУ

Нічога ня ведаюць

«Зьвязда» ўжо адзначала некалькі раз, што нашы прафсаюзы празявалі 1-шы квартал бягучага году і не дапамаглі прадпрыемствам пепш арганізаваць сваю работу для пасьпяховага выкананьня прамфінпляну. Прэзыдыум ЦСПСБ у сваёй пастанове ад 10-га студзеня запрапанаваў усім ЦП прафсаюзаў неадкладна заслухаць інфармацыі кіраўнікоў прадпрыемстваў і фабзаўмясцкомаў аб выкананьні прамфінпляну, папепшыць кіраўніцтва масавай работай на прадпрыемствах, сапраўды стаць тварам да вытворчасьці. Гэта дырэктыва ня выканана. Мы канстатуем, што прафсаюзы і зараз ня ведаюць, што робіцца на прадпрыемствах.

У Белкамітэце саюзу харчавікоў нашаму супрацоўніку заявілі, што ніякіх вестак аб рабоце прадпрыемстваў за студзень месяц у іх няма. «Прыдзеце 15-га лютага, тады можа што-небудзь дамо», —сказалі нашаму супрацоўніку.

У ЦП саюзу швэйнікаў таксама вестак аб ходзе работы на прадпрыемствах за студзень месяц няма. Нават няма вестак за першую і другую дэкаду (20 дзён). «Да 15-га нічога сказаць ня зможам».

У Белкамітэце саюзу мэталістых зьдзівіліся: «Прамфінплян за студзень? Няма вестак. Нашы прадпрыемствы такія вялікія, што дэкадных вестак рабіць нельга».

— Зойдзеце 15-га лютага,—сказалі дрэваапрацоўшчыкі,—пакуль што нічога не дамо.

І толькі гарбары абяцалі: «дамо зводкі праз пару дзён».

Гэтыя адказы, зразумела, не характарызуюць кепскі вучот выкананьня прамфінпляну нашымі прадпрыемствамі, бо матар'ялы, якія друкуюцца і друкаваліся ў «Зьвяздзе», даводзяць, што весткі аб выкананьні прамфінпляну амаль на ўсіх прадпрыемствах ужо ёсьць. Ня маюць іх толькі нашыя прафорганы.

Мы яшчэ раз завастраем пытаньне на недапушчальных адносінах прафэсыянальных арганізацый да інтарэсаў вытворчасьці, да выкананьня прамфінпляну бягучага году. Мы лічым, што прэзыдыум ЦСПСБ павінен зрабіць адсюль належныя вывады.

ДРЭННА!

ВІЦЕБСК. Абутковая фабрыка імя Лекерта выканала прамфінплян 1-га кварталу бягучага году **толькі на 82,3 проц.** Па асобных відах прадукцыі, як напрыклад, па рантавым абутку вытворчая праграма выканана толькі на 56,9 проц. Дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту недавыканана на 2,3 проц. Прадукцыйнасьць працы павышана замест 11 проц. толькі на 9,6, затое заработная плата вырасла замест 6,6 проц. на 13,7 проц.

Гэтыя лічбы павінны былі мабілізаваць усю ўвагу ўсяго калектыва фабрыкі да выкананьня прамфінпляну. На жаль гэтага няма. **Студзень паказвае зноў недавыкананьне прамфінпляну на 17 проц.**

А—с.

Супакоілася на посьпехах

Швэйная фабрыка „Кастрычнік“ сарвала прамфінплян

Падагульваючы вынікі выкананьня прамфінпляну ў першым квартале, «Зьвязда» адзначыла **вялікія посьпехі Менскай швэйнай фабрыкі «Кастрычнік»** і зьмясьціла яе **на чырвоную дошку.** Фабрыка ў першым квартале выканала вытворчую праграму на 103,9 проц., павялічыла прадукцыйнасьць працы супроць пляну на 5,6 проц., зьнізіла сабекошт на 8 проц. замест вызначаных паводле пляну 5,5 проц.

Але фабрыка супакоілася на гэтых посьпехах і 2-гі квартал пачала вялізарным прарывам. Студзень паказвае недавыкананьне вытворчай праграмы **на цэлыя 18 проц.**

А. М.

Дрэнная якасьць павялічвае сабекошт

ЗАПЫТАНЬНЕ ДА РАБОЧЫХ „БАЛЬШАВІКА“

Абутковая майстэрня Гандальбуду ў першым квартале выканала вытворчую праграму з некаторым перавышэньнем — на 0,5 проц., зьменшыла брак — замест ранейшых 1,2 проц. да 0,3 проц. Але замест зьніжэньня сабекошту на 6 проц. **фабрыка мае амаль што павялічэньне сабекошту.** Гэты абураючы факт тлумачыцца выключна тым, што паўфабрыкаты вырабу гарбарні «Бальшавік» — **вельмі дрэннай якасьці.**

— Хром заводу «Бальшавік» ні ў якім разе нельга параўнаць з хромам Багародзкага або Асташкаўскага заводаў. Брак апошніх заводаў лепшы за хром **3-га гатунку** вырабу заводу «Бальшавік», — вось што кажуць рабочыя майстэрні Гандальбуду.

Мы пытаемся ў рабочых «Бальшавіка», **што імі зроблена для паляпшэньня свае прадукцыі.**

Рабкор І. Ф.

КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ

Гэраічная барацьба бэльфорскіх тэкстыльшчыкаў

ПАРЫЖ, 7. Магутны забастовачны рух у Бэльфоры тэкстыльшчыкаў і мэталістых ня толькі працягваецца, але ўсё больш пашыраецца. У Шампаніі, недалёка Бэльфору, 200 рабочых ліцейных заводаў далучыліся ўчора да забастоўкі, прад'явіўшы прадпрыемцам патрабаваньні павысіць зарплату. Будаўнічыя рабочыя Бэльфору таксама выпрацоўваюць патрабаваньні і гатовы далучыцца да салідарнае барацьбы. Адначасова ўзмацняюцца рэпрэсіўныя меры. Узмацняецца кампанія рэфармістых па зрыве забастоўкі. Два работнікі унітарных прафсаюзаў мэталістых прыцягнуты да адказнасьці па абвінавачаньні «ў закліках да гвалту». Выданы загад аб арышце 2-х тэкстыльшчыкаў — членаў забастовачнага камітэту. Забастовачныя пікеты арыштоўваюцца. У гарадку Морэз, у дэпартаманце Жура, дзе ўжо больш 2-х тыдняў бастуюць 2.100 рабочых аптычнае прамысловасьці, прыступлена да рэпрэсій. Праводзяцца арышты сярод прафсаюзных работнікаў і членаў забастовачнага камітэту.

Новы паход беспрацоўных на Лёндан

ЛЁНДАН, 7. Рада па арганізацыі руху беспрацоўных пастанавіла арганізаваць у хуткім часе новы паход беспрацоўных на Лёндан. Паход будзе праведзены пад лёзунгам: «Супроць палітыкі рабочага ўраду ў прамыслова аб беспрацоўі».

У радзе акругі ужо пачалася падрыхтоўка да паходу. У сувязі з гэтым сярод беспрацоўных адкрыта ўзмоцненая кампанія прапаганды супроць выпадкаў зьняцьця беспрацоўных з дапамогі, якія за апошні час сталі частымі.

Зьезды рэвалюцыйнай прафсаюзнай апазыцыі ў Нямеччыне

БЭРЛІН, 3. Адначасова з акруговым зьездам бэрлінскае рэвалюцыйнае прафсаюзнай апазыцыі адбыліся таксама акруговыя зьезды прафсаюзнай апазыцыі ў цэлым радзе іншых гарадоў Нямеччыны. Зьезд акругі ў Гальле-Мэрзэбурґ адбыўся пры ўдзеле 260 дэлегатаў, якія зьяўляліся прадстаўнікамі 120.000 рабочых прадпрыемстваў і беспрацоўных.

Зьезд рэвалюцыйнае прафсаюзнай апазыцыі Ўсходняе Прусіі адбыўся ў Кёнігсбэрґу пры ўдзеле 188 дэлегатаў, з якіх 100 — камуністыя. На зьезд зьявілася дэлегацыя прыбонага саюзу франтавікоў. 16 дэлегатаў уступілі ў кампартыю.

ПАД ЗНАКАМ ЗРУЙНАВАНЬНЯ І ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВАЙНЫ

ПАЎМІЛЬЁНА БЕСПРАЦОЎНЫХ У ГОРАДЗЕ, 3 МІЛЬЁНЫ У ВЁСЦЫ—

ВОСЬ ВЫНІК КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ „СТАБІЛІЗАЦЫІ“ У ПОЛЬШЧЫ

З ПРАМОВЫ КАМДЭПУТАТА ЖАРСКАГА Ў СОЙМЕ

ВАРШАВА, 6. У часе дыскусіі па бюджэце ў сойме выступіў з вялікаю прамовай камуністычны дэпутат Жарскі. Тав. Жарскі сказаў:

«Ян відаць з праекту бюджэту, больш палавіны ўсіх выдаткаў ідзе на патрэбы вайсковага міністэрства, міністэрства ўнутраных спраў, ютыцыі і замежных спраў, г. зн. тых міністэрстваў, уся дзейнасьць якіх накіравана да задушэньня рэвалюцыйнага руху і падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Камісія сойму павялічыла бюджэт на 300 млн. злотых больш, чым патрабаваў урад, што зьяўляецца довадам аб'яднаных намаганьняў усяго фашысцкага лягеру, беспартыйнага блёку і ППС, да ўмацаваньня фашызму ва ўмовах гаспадарчага крызісу, які паглыбляецца. У сучасны момант зарэгістравана звыш 230.000 беспрацоўных у гарадох, тады як фактычная лічба дасягае паўмільёна. У вёсцы налічваецца да 3 млн. беспрацоўных. Такія выніні загнываньня капіталістычнае стабілізацыі.

Колькі асыгнавана на барацьбу з беспрацоўем з 300 млн., якія сойм дадаў ураду? З 3-хмільярднага бюджэту беспрацоўная сям'я атрымлівае 12 злотых у месяц. Такі ваш здрадніцкі падарунак рабочай клясе.

Ва ўсім сьвеце,—кажа т. Жарскі,—ёсьць толькі адзін край, у якім няма ўзрастаючай хвалі беспрацоўя. Гэты край—СССР. СССР зьяўляецца адзіным краем, які ня ведае крызісу. Таму і расьце нязавісьць, таму актыўна падрыхтоўваецца вайна супроць краю дыктатуры пралетарыяту.

Тав. Жарскі падае лічбы росту савецкае прамысловасьці, лічбы, якія малюць магутны рух калектывізацыі сельскае гаспадаркі СССР і гаворыць: «сацыялістычнае будаўніцтва СССР—фактар, які мабілізуе рабочую клясу ўсяго сьвету на барацьбу супроць капіталу, супроць падрыхтоўкі вайны з СССР. Гаспадарчы крызіс у Польшчы ідзе роўнаежна з паглыбленьнем палітычнага крызісу фашысцкае дыктатуры. Фашызм сустракае рэзкі адпор з боку мас. Фашысцкай дыктатуры застаецца адно—узмацняць тэрор супроць рабочае клясы і сялянскае масы прыгнечаных Польшчаю нацый. Самы актыўны ўдзел у гэтым тэроры прымаюць ППС, «Вызваленьне» і Сялянская партыя. Мы, камуністыя, ідзем у масы і заяўляем:

— Бюджэт неабходна адхіліць, барацьбу супроць фашысцкае дыктатуры трэба ўзмацніць. Аб'яднаньне барацьбы рабочых і сялян прыгнечаных Польшчай нацый зьяўляецца адзіным шляхам зьвяржэньня фашысцкае дыктатуры і ўстанаўленьня дыктатуры пралетарыяту (бурныя воплескі на паўках рабоча-сялянскіх дэпутатаў). (ТАСС).

Загад аб арышце 282.124 сялян у Грэцыі

БЭРЛІН, 5. Орган нямецкае кампартыі «Ротэ Фанэ» паведамляе, што сялянства Грэцыі, у сувязі з непамернымі падаткамі і зьніжэньнем цэн на важнейшыя прадукты сельскае гаспадаркі, знаходзіцца ў надзвычай цяжкім становішчы. Па трох правінцыях урад выдаў загад аб арышце 282.124 сялян за невыплату падатку. Лік выплатнікаў падатку ўсё павялічваецца. **За няўплату падаткаў арыштоўваюць пагалоўна насельніцтва цэлых вёсак.**

Наглядаецца рост хваляваньня сярод сялянства, якое стварае свае рэвалюцыйныя арганізацыі.

Францыя на аванпостах антысавецкага наступленьня

Францыя менш, чым які-небудзь іншы край, капіталістычнай Эўропы, закранута прамысловым крызісам. Хоць лічбы афіцыйнае статыстыкі даюць у апошнія месяцы паказаньні на некаторае зьніжэньне вытворчасьці, а гандлёвы балянс паказвае на значнае зьмяншэньне французскага вывазу за граніцу, усё-ж таго малюнку прамысловага заняпаду і вялізарнага беспрацоўя, які можна наглядаць у сучасны момант у Нямеччыне. Польшчы і Англіі, у Францыі пакуль ня відно. Тым ня менш, абвастрэньне клясавае барацьбы мае месца і ў Францыі, паколькі французская буржуазія сваёй галоўнай мэтай на бліжэйшы перыяд лічыць рацыяналізацыю вытворчасьці.

Рацыяналізацыя, натуральна, цягне за сабой і некаторае зьніжэньне патрэбнае для прамысловасьці рабочай сілы. Акрамя таго, у Францыі бесьперапынна даражэюць прадметы першае патрэбы, асабліва прадукты харчаваньня, паколькі гандаль гэтымі прадуктамі манапалізаваны буйнымі капіталістычнымі кампаніямі, якія, з аднаго боку, абіраюць сялян, плацячы ім нізкія цэны на с.-г. тавары, а з другога — грабяць гарадзкое насельніцтва цілях павышэньня продажных цэн. У сувязі з гэтым у Францыі шырокім патокам разьлілася за апошні год забастовачная барацьба рабочае клясы, прычым барацьба гэта **носіць наступальны характар** і выказваецца, галоўным чынам, у патрабаваньнях павышэньня зарплаты.

Французская сацыялістычная партыя і рэфармістыя, якія стаяць на чале Ўсеагульнае канфэдэрацыі працы, выконваючы сваю звычайную ролю памочнікаў капіталу, самым рашучым чынам супрацьціўляюцца забастовачнаму руху, каторы яны абвяшчаюць «камуністычнай інтрыгай». Але французскі пралетарыят рэагуе на здрадніцкую палітыку рэфармістых сваім адыходам ад рэфармісцкага кіраўніцтва і сваім хуткім палявеньнем, якое разбурае ўсе надзеі і камбінацыі сацыялістых і цэнтралізаванага капіталу. Французская буржуазія таму з кожным днём прасякаецца ўсё больш упэўненасьцю, што адзіным правадыром французскага пралетарыяту становіцца камуністычная партыя і што толькі шляхам разгрому кампартыі ёй удасца ламаць баявы настрой рабочае клясы. Фашысцкія настроі ўсё больш прасякаюць палітыку французкага ўраду, таксама, як усе парляманцкія партыі, у тым ліку і тыя, што называюць сябе «апазыцыйнымі».

У кіраўнічых колах буржуазіі ўсё больш мацнее перакананьне, што ўплыў кампартыі на рабочую клясу будзе ламаны тады, калі кампартыя будзе адарвана ад Камінтэрну. Гэтым і тлумачыцца тое захапленьне, з якім панючыя клясы Францыі сустракаюць разгалосьсі ўнутры кампартыі і «бунты» правых і левых апартуністых супроць Камінтэрну. А з прычыны таго, што Камінтэрн знаходзіцца ў Маскве і посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР зьяўляюцца фактарам, які рэвалюцыянізуе французкі пралетарыят, дык адсюль робіцца лёгічны вывад, што для задушэньня насьпяваючай у Францыі рабочае рэвалюцыі трэба, у першую чаргу, пакончыць з СССР.

Цяпер заўважаецца актывізацыя варожасьці французкае палітыкі ў адносінах да СССР, што асабліва выразна выяўлялася ў вядомым працэсе падробшчыкаў савецкіх вэксалёў.

На абарону Савелія Літвінава і кампаніі гарою паўсталі, як расійскія белагвардзейскія эмігранты, так і ўплывовыя колы французкай буржуазіі. На судзе злоўленыя жулікі, пры поўным патураньні судзьдзяў і пракуратуры, выступалі амаль што ў ролі палітычных мучанікаў. Пасьля прамоў адвакатаў, якія зьяўляліся на сутнасьці пагромнай антысавецкай агітацыяй, суд поўнасьцю прыняў, што вэксалі сапраўды фальшывыя, тым ня менш апраўдаў усіх падсудных. Французская буржуазія пры поўным падтрыманьні ўраду выкінула такім чынам лёзунг: «у адносінах да СССР усё дазволена». Вынікі зараз-жа выявіліся.

26-га студзеня зьнік невядома дзе вядомы белагвардзейскі генэрал Куцепаў, былы камандзір добраахвотнай арміі і галава эміграцкае зграі, які падтрымліваў прэтэнзіі на «расійскі прастол» былога вялікага княжа Мікалая Мікалаевіча. Ён вышаў з дому, накіроўваючыся ў расійскую царкву, але па дарозе як скрозь зямлю праваліўся. Мяркуючы па тым, што, як высьветлена, генэрал «зьнікаючы» захапіў з сабою буйную суму грошай, якія належалі «мікалаеўцам», белагвардзейскія колы, а разам з імі і рэакцыйны французкі друк узьняў нячуваную па сваёй нагласьці кампанію супроць поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР, абвінавачваючы яго ў «кражы» Куцепава і ў забойстве яго.

Антысавецкае цкаваньне дайшло да такое ступені, што поўпрэдг СССР тав Даўгалеўскаму прышлося выступіць у міністэрстве замежных спраў з пратэстам супроць нячуваных паводзін французкага ўраду, які дапускае заклікі да гвалту над дыпляматычнымі прадстаўнікамі краю, каторы знаходзіцца з Францыяй у нармальных адносінах. Справа ў тым, што ва многіх французкіх газэтах зьявіліся заклікі да вобыску ў пасольстве, а белагвардзейцы адкрыта заяўляюць, што яны рыхтуюць налёт на поўпрэдатва.

Само сабою вразумела, што калі-б французкая ўлада хацела палажыць канец гэтай агіднай кампаніі, падобныя заклікі не маглі-б зьявіцца на старонках друку. Але ўрад Тардзье робіць выгляд, што яго гэта кампанія не датычыць. Інакш кажучы, антысавецкае цкаваньне патураецца ўрадам Тардзье і ва Францыі стварыліся абставіны, якія нагадваюць часы перад разрывам адносін паміж Англіяй і СССР.

Цяжка дапусьціць, каб французкая буржуазія адважылася цяпер на падобны шаг, прыняўшы пад увагу, што Англія якраз нядаўна адмавіла паруша-ныя дыпляматычныя зносіны. Але, з другога боку, рост антысавецкіх настрояў пасьля Гаагі сярод нямецкае буржуазіі і ўзмоцненыя атакі ангельскіх кансэрватараў на ангельска-савецкую згоду даваліюць меркаваць, што **ў Эўропе ідзе энэргічная падп

За бальшавіцкае кіраўніцтва бальшавіцкай Гомельскай арганізацыяй

Аб апошнім сходзе партактыву

(Перадавіца „Полесской Правды“ ад 5-II 1930 г.)

Сход партактыву ўсіх трох раёнаў, які адбыўся 2-га лютага, зьяўляўся працягам мінулага сходу актыву ад 31-га сьнежня, прысьвечанага пытаньням аб стане самакрытыкі ў Гомельскай арганізацыі. Але апошні сход (ад 2-га лютага) павінен быў значна адрозьнівацца ад першага тым, што ён праходзіў у іншых умовах. Ужо да гэтага сходу падасьпелі пастановы ЦКК КП(б)Б па радзе буйнейшых памылак у пастановах АКК, аб грубых парушэньнях самакрытыкі па радзе рабкораўскіх спраў. Таксама на пярэдадні была вынесена пастанова аб'яднанага бюро АК і прэзыдыуму АКК, пленуму АК і АКК, у якой гэтыя памылкі падкрэсьліваліся з усёй сілай, рабіліся належныя палітычныя вывады, інакш кажучы, гэты сход быў асобным і яго трэба расцэньваць самастойна.

Здавалася-б, што апошні сход актыву павінен быў з найвялікшай увагай і актыўнасьцю абмеркаваць становішча ў арганізацыі, выкрыць прычыны парушэньня самакрытыкі, жорстка раскрытыкаваць дапушчаныя памылкі і, улічыўшы іх, зрабіць належныя ўрокі для ўсёй арганізацыі, але гэта ня было зроблена.

Папершае, аб дакладзе. Тав. Малаковіч замест дакладу зрабіў фактычна толькі інфармацыю, у якой зачытаў некаторыя пастановы ЦКК і дадаў да іх некалькі заўваг, якія далёка не давалі вычарпальнага аналізу прычын усіх памылак; што асабліва недапушчальна— гэта тое, што тав. Малаковіч не зрабіў належных папітычных вываду з усіх гэтых спраў.

Падругое, аб спрэчках. Апрача выступленьня двох-трох таварышоў, спрэчкі далёка не адпавядалі сутнасьці пытаньня, якое абмяркоўвалася. Крытыкі і самакрытыкі ў спрэчках амаль што не адчувалася. Гэтыя спрэчкі значна прынізілі прынцыповую важнасьць прарываў, якія мелі месца, нават у параўнаньні з мінулым годам, калі пастановы ЦКК яшчэ ня было. Вінаваты ў гэтым перш за ўсё прэзыдыум сходу і дакладчык, якія не далі належнай установкі. Зусім незразумелым зьяўляецца тое, што ў спрэчках не выступалі члены бюро АК і прэзыдыуму АКК. Старшыня АКК тав. Зэмнэк абмежаваўся толькі нязначнай даведкай у канцы сходу ад перахлістваньні самакрытыкі і толькі.

Патрэцяе, аб рэзалюцыі. Хаця сход актыву далучыўся адногалосна да пастановы пленуму АК і АКК, але, нам здаецца, гэтага мала. Актыў павінен быў сказаць сваё слова аб памылках, якія мелі месца, і завастрыць сваю ўвагу перад усёй партарганізацыяў на гэтым пытаньні, вызначыць практычныя мерапрыемствы па далейшым разгортваньні самакрытыкі і барацьбе з глушыцелямі яе. Гэтага зроблена ня было.

Пачацьвертае, аб самым сходзе. Ужо ў сярэдзіне сходу пачалася масавая ўцечка з залі. А ў канцы сходу, калі прымалася рэзалюцыя, у залі было ня больш аднэй трэцяй прысутных у пачатку сходу, прычым некаторыя з актыву, асабліва на галёрцы, спакойна храпелі. Між тым, нельга сказаць, што гэты сход быў асабліва зацяжным, як гэта звычайна бывае. Ужо адзін гэты факт гаворыць аб тым, што актыў ня быў на вышыні сваёй задачы.

МЫ ПРАПАНУЕМ:

у бліжэйшы час склікаць пашыраны сход актыву, на якім паставіць даклад аб выніках абсьледваньня работы АКК і аб стане самакрытыкі ў сувязі з рабкораўскімі справамі, пры гэтым пажадана прысутнасьць прадстаўніка ЦКК.

На бліжэйшых сходах парт'ячэек абмеркаваць пытаньні аб парушэньнях самакрытыкі і грунтоўна прапрацаваць пастановы ЦКК.

Мы ўзьнімаем гэтыя пытаньні таму, што сход, які адбыўся, ня даў нашай партарганізацыі належнага тону, невыстарчальна ўзброіў партарганізацыю ў барацьбе да сапраўдную самакрытыку супроць заціскаў яе. Гэта наша думка.

Новыя фахты заціску самакрытыкі

Залінейны райком праводзіць старую лінію

Нам здаецца, што грубыя парушэньні самакрытыкі ў Гомелі, выяўленыя абсьледваньнем ЦКК КП(б)Б, і зробленыя па гэтым пытаньні прэзыдыумам ЦКК палітычныя вывады павінны былі паслужыць добрай навукай для тых, хто ўціскаў самакрытыку або імкнецца заціснуць яе. На жаль, некаторыя факты з Гомельскай рэчаіснасьці сыгналізуюць аб тым, **што гэтыя вывады ня ўлічаны і што глушыцелі самакрытыкі дзе-ні-дзе ня спыняюць нагла . парушаць лёзунг партыі аб разгортваньні дзейснай пралетарскай самакрытыкі, не зважаючы на асобы.**

Пядаўна, на старонках **«Полесской Правды»** была зьмешчана заметка тав. **Зэльманава** аб тым, што кучка чыноўнікаў з «ГЭТ'у» арганізавала паход супроць рабкора **Малева.** Наўкола тав. Малева за яго рабкораўскую дзейнасьць створана абстаноўка замаскаванага і наглага цкаваньня. Гэтае цкаваньне, ня гледзячы на выразныя пастановы райкому партыі па справе тав. Малева, ня спыняецца.

На вялікі жаль, гэтыя факты абурючага заціску самакрытыкі і цкаваньня рабкораў **пасьля ўжо абсьледваньня ЦКК КП(б)Б Гомельскай арганізацыі,** не адзінкавыя. **«Полесская Правда»** ў нумары за 5-га лютага, у артыкуле «До каких пор?» падае новыя факты грубага парушэньня асноўных прынцыпаў самакрытыкі.

На заводзе імя Ланцуцкага вядзецца цкаваньне рабкора **Панава.** Загачык АПА парткалектыву заводу, тав. **Шклярэнка,** пачаў пісаць у газэту беспадстаўныя наклёпніцкія артыкулы, пакіраваныя супроць рабкора тав. Панава. Шклярэнка нагла абвінавачвае тав. Панава ў тым, шбы ён «скарыстоўвае лёзунг партыі аб самакрытыцы, і, прыкрываючыся годнасьцю рабкора, імкнецца заняць недзе пейкае цёпленькае «местечко».

Рэдакцыя, зразумела, не зьмясьціла гэты ліст, дзе Шклярэнка, пры дапамозе рашуча асуджаных партыяй мэтадаў, імкнецца беспадстаўна і паклёпніцкі дыскрэдытаваць рабкора Панава. Гэты ліст быў пакіраваны ў Залінейны райком партыі. Аднак, Залінейны райком яшчэ да гэтага часу нічога **не зрабіў** па вырашэньні гэтае справы. На падставе гэтых фактаў **«Полесская Правда»** робіць вывад, што «Залінейны райком у пытаньнях самакрытыкі ня здолеў хутка і энэргічна пакласьці канец беспадстаўнаму цкаванью і здзекам з рабкора».

Рэдакцыя **«Полесской Правды»** ў гэтым-жа артыкуле публікуе новыя матар'ялы, якія сыгналізуюць аб цкаваньні рабкора тав. **Барташевіча.**

«Полеская Правда» па бальшавіцку рубам ставіць пытаньне перад Залінейным райкомам партыі:

«Да якога часу, пытае **«Полесская Правда»,** будзе працягвацца цкаваньне рабкораў - актывістых? Да якога часу вы (Залінейны райком партыі) будзеце дапускаць скажэньне лёзунгу партыі аб самакрытыцы?

Час ужо па-бальшавіцку раз назаўсёды ўдарыць па руках глушыцелям рабочай актыўнасьці, ініцыятывы мас».

Мы цалкам і поўнасьцю далучаемся да апошняга выводу рэдакцыі «Полесской Правды». **Недапушчальна і ганебна, калі ў Гомелі пасьля абсьледваньня ЦКК КП(б)Б, пасьля выкрыцьця грубых памылак АК і АКК у пытаньнях самакрытыкі, яшчэ мелі месца факты наглага цкаваньня рабкораў і адкрытага заціску самакрытыкі.** Мы лічым, што Залінейны райком партыі сваім нерэагаваньнем на факты заціску самакрытыкі, сваёй павольнасьцю і нерашучасьцю пры вырашэньні новых рабкораўскіх спраў, па сутнасьці тармозіць разгортваньне дзейснай самакрытыкі, не зважаючы на асобы. Па гэтай нерашучасьці і павольнасьці ў пытаньнях абароны рабкораў ад глушыцеляў самакрытыкі, па гэтых прымірэнчых адносінах да тых, хто груба скажае лёзунг партыі аб самакрытыцы, трэба рэзка і жорстка ўдарыць.

Яшчэ аб памылках парткіраўніцтва

Партыйнае кіраўніцтва нашай Гомельскай арганізацыі дапусьціла шэраг грубых палітычных памылак. Парушэньне лёзунгу партыі аб самакрытыцы ў пістановах АКК, частко́ва і АК па рабкораўскіх справах; прымірэнчыя адносіны да права-апартуністычнай практыкі ў Новабеліцкай арганізацыі; беспадстаўныя абвінавачваньні ячэйкі чыгуначнага палку ў «левым» загібе за тое, што яна рэзка па-бальшавіцку крытыкавала апартуністычныя памылкі Новабеліцкага райкому і натрабавала зьмены кіраўніцтва ў райкоме,—вось асноўныя памылкі, меў шыя месца і адзначаныя ў пастановах ЦКК і апошняга аб'яднанага пленуму АК і АКК.

Па сутнасьці сваёй, гэтыя памылкі ўскрываюць клубок права-апартуністычнай практыкі ў паасобных частках нашае арганізацыі і прымірэнчых адносін да яе з боку партыйнага кіраўніцтва. Чым-жа іншым, як не адкрытым апартунізмам, можна назваць масавую расправу з рабкорамі на новабеліцкіх прадпрыемствах за самакрытыку, зажым самакрытыкі ў шэрагу ячэек гэтага і іншых раёнаў, паход раённага кіраўніцтва Н.-Беліцы супроць ячэйкі чыгуначнага палка, якая асьмелілася рашуча і да канца асудзіць права-апартуністычную практыку райкому. «Апартуністы заўсёды крычыць аб «свабодзе крытыкі». Але як толькі ён сам становіцца на чале кіраўніцтва, дык тут-жа бязьлітасна распраўляецца з тымі, хто на справе рэалізуе лёзунг партыі аб самакрытыцы. Для апартуністага бальшавіцкая самакрытыка сьмерці падобная. Вось чаму раённае кіраўніцтва сумесна з акр. КК выключае рабочых з партыі за тое, што яны ўтрох даюць допіс у за тое, што яны «ўтрох даюць допіс у газэту». Гэта піша «Правда» ў перадавой газэту». Гэта піша «Правда» ў перадавой партаддзелу 3-га лютага, адносна апартуністычных памылак Новабеліцкага райкому, і гомельскага парткіраўніцтва наогул.

І калі сакратар АК тав. Малаковіч у сваёй прамове на прадапошнім пленуме АК абвінаваціў ячэйку чыг. палку ў «левым» загібе, дык гэта залішні раз сьведчыць аб тым, што партыйнае кіраўніцтва ня толькі ня здолела разгледзіць рашучую барацьбу з правым апартунізмам на практыцы, з заціскам самакрытыкі, але аказалася ў палоне апартунізма, прымірэнча адносілася да канкрэтных яго праяў.

«Правы апартуністы, стаячы ў кіраўніцтве, абвінавачвае ў трацкізьме членаў партыі пасьлядоўна праводзячых у жыцьцё лінію партыі. Апартуністы высоўваюць абвінавачаньне ў трацкізьме супроць таварышоў стаячых на пазыцыі партыі для таго, каб з імі расправіцца. Такі мэтад па сутнасьці практыкаваўся гомельскім партыйным кіраўніцтвам». («Правда»).

У сьвятле вось гэтай, зусім правільнай, бальшавіцкай характарыстыкі, дадзенай «Праўдай» памылкам гомельскага кіраўніцтва, зусім нецярпімымі становяцца паўторныя памылкі, дапушчаныя парткіраўніцтвам ужо за апошнія дні. Мы маем на ўвазе тое, што мела месца на пленуме АК і АКК і на апошнім агульна-гарадзкім партактыве.

На пленуме АК і АКК некаторымі таварышамі рабіліся спробы ў сваіх выступленьнях даказаць, што масы аднадушна патрабавалі «расправы» з крытыкуючымі, што пад «націскам» мас гэтыя няправільныя пастановы па справах рабкораў і прымаліся. Тут зусім відавочна прасоўваецца думка аб тым, што «масы віноваты, а не кіраўніцтва». З гэтай жа «опэры» выходзіць думка некаторых прамоўцаў аб тым, што галоўная прычна памылак заключаецца ў слабасьці культмасавай работы, і пагэтаму самакрытыка ў масах яшчэ не засвоена. Вось гэтым і іншым дзеляцкім настроям не быў дадзены рашучы адпор.

Гэткія вось «аналізы» прычын дапушчаных памылак нічога агульнага не маюць з сапраўднай падаплёкай, якая заключаецца ў тым, што партыйнае кіраўніцтва не заўважыла і недаацэніла канкрэтных праявы правага апартунізму ў паасобных зьвеньнях арганізацыі, прымірэнцкі да іх адносілася. «Прымірэнец адносіцца цярпіма, лёяльна да тых, хто парушае лінію партыі, хто зьбіваецца з клясавай пазыцыі, да тых, хто дапамагае клясаваму ворагу. Ён прыкрывае апартуністых. У той жа час прымірэнец выкарыстоўвае ўсе магчымыя меры для барацьбы супроць тых, хто абараняе лінію партыі. Прымірэнец абараняе «свабоду крытыкі», калі яна накіравана супроць партыі і заціскае самакрытыку, калі яна накіравана супроць апартуністых». Гэтая ацэнка прымірэнцу дадзеная «Праўдай» дае сапраўдны аналіз прычыны дапушчаных памылак.

Аб сходзе актыву «Палеская» ўжо пісала ўчора ў перадавой. Застаецца дадаць і падкрэсьліць тое, што парткіраўніцтва на гэтым сходзе ня здолела паставіць пытаньне аб памылках з усёй бальшавіцкай упартасьцю, не завастрыла ўвагу партарганізацыі на апартуністычных памылках у паасобных частках арганізацыі і на апартуністычнай сутнасьці памылак АКК і АК.

Між тым задачы далейшага разгортваньня самакрытыкі, асабліва патрабуюць самай вострай пастаноўкі пытаньня аб меўшых месца памылках. Нельга забываць таго, што ў нашай акруговай арганізацыі выкрыты факты заціску самакрытыкі у іншых раёнах і ячэйках, акрамя паказаных у пастановах ЦКК, і што патрэбнага пералому яшчэ няма. Досыць паказаць на тое, што ў залінейнай арганізацыі, асабліва на заводзе «Ланцуцкага» ёсьць ня толькі спробы, але і праводзіцца некаторымі несправядлівымі камуністымі старая лінія супроць самакрытыкі і крытыкуючых, ня гледзячы на досыць моцныя і дзейныя пастановы ЦК, АК і АКК адносна самакрытыкі ў залінейнай арганізацыі. Гэта сыгналізуе ад тым, што вурокі прарываў у самакрытыцы не засвоены ў арганізацыі. Над гэтым яшчэ прыдзецца сур'ёзна паработаць у бліжэйшы час.

Бальшавіцкая непрымірымасьць перш за ўсё вызначаецца ў тым, каб з усёй ярасьцю абрушыцца на ўсякія ўхілы і скрыўленьні лініі партыі, у тым ліку і ў сваёй рабоце, канцэнтраваць навакол іх увагу мас, мабілізаваць масы на барацьбу супроць іх. У гэтым і сутнасьць бальшавіцкай самакрытыкі. На апошнім партактыве, парткіраўніцтва з гэтай задачай не справілася. Гэту памыляку трэба выправіць. З яшчэ большай напружанасьцю трэба выправіць памылкі, узьняць актыўнасьць партыйнай масы на барацьбу з правым апартунізмам і прымірэнцтвам. Гэта асабліва патрабуецца зараз, калі партыя вырашае складаныя задачы гаспадарчага будаўніцтва і робіць рашучы паварот у сваёй палітыцы, накіраванай на разгортваньне калектывізацыі і зьліквідаваньня эшэтак капіталізму.

(«Полесская Правда» № 31).

„Полесская Правда“ прызнае свае памылкі

У **«Полесской Правде»** апублікаваны дзьве пастановы партыйнай часткі рэдакцыі ў сувязі з памылкамі, дапушчанымі рэдакцыяй **«П. П.»** у радзе рабкораўскіх спраў, і артыкулам тав. **Зярніцкага,** зьмешчаным у **«Зьвязьдзе»** (№ 27). У першай пастанове гаворыцца:

«Адзначыць, што памылкі рэдакцыі, дапушчаныя ў радзе рабкораўскіх спраў (т. т. Маркава, Дубава, Гаўрылава, Мяжэньнікава і інш.), мелі месца: **а) у выніку няправільнай установкі, накіраванай на выкрыцьцё рабкораў, на капаньне ў іх мінулым, на вышукваньне клясавага ворага сярод рабкораў; б) у выніку «штампаванага» падыходу да пастаноў АКК і АК па справах рабкораў і асьвятленьня іх бяз пэўнай думкі рэдакцыі ў адносінах да гэтых пастаноў і в) у выніку адсутнасьці калектыўнасьці ў рабоце рэдакцыі».**

Другая пастанова прынята 3-га лютага, пасьля абмеркаваньня артыкулу тав. Зярніцкага ў «Зьвязьдзе», прысьвечанага памылкам рэдакцыі **«Полесской Правды».**

«Прызнаць, што палажэньні, высунутыя ў артыкуле тав. Зярніцкага, зьяўляюцца правільнымі. Адказныя працаўнікі, якія працавалі ўвесь час у рэдакцыі, ня зьнімаюць з сябе віны ў тых адносінах, што яны не ўваходзілі ў сутнасьць гэтых спраў і своячасова не ўзьнялі належнага пратэсту супроць памылковых пастаноў АК і АКК і лініі рэдакцыі ў гэтых пытаньнях».

ПРЫЕЗД РАБОЧАЙ БРЫГАДЫ МАСКОЎСКАГА ЭЛЕКТРАЗАВОДУ

У Менск прыехала рабочая брыгада маскоўскага электразаводу, які шэфствуе над Наркамфінам СССР. Разам з брыгадаю прыехаў прадстаўнік галоўнага кіраўніцтва ашчаднымі касамі СССР т. **Гарніч.**

У задачы брыгады ўваходзіць—праверыць падрыхтоўку ашчадных кас да месячніка, а таксама дапамагчы мясцовым касам ашчаднасьці ў правядзеньні месячніка.

Учора рабочая брыгада заслухала даклад начальніка галоўнай ашчаднай касы БССР т. **Падольскага** аб арганізацыі і ходзе кампаніі месячніка ашчаднасьці ў БССР. Брыгада прабудзе ў Менску каля 2-х тыдняў.

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

(АД 5-га ЛЮТАГА 1930 г.)

Заслухаўшы паведамленьне тав. Команава аб пастановах ЦКК па пытаньні аб фактах заціску самакрытыкі і парушэньня ўнутрыпартыйнае дэмакратыі, якія мелі месца ў Гомельскай партарганізацыі, Бюро ЦК поўнасьцю ухваляе ўсе прынятыя ЦККК пастановы па гэтым пытаньні.

Бюро ЦК канстатуе, што па цэлым радзе рабкораўскіх спраў (Дубаў, Зэйка, Крыштафук, Маркаў, Мяжэньнікаў, Вясёлаў, Кочаноўскі і інш.) АК і АКК прынялі палітычна няправільныя пастановы, якія па сутнасьці дапамагалі заціску самакрытыкі ў радзе ячэек і раёнаў Гомельскае партарганізацыі.

Замест рашучага і сьмелага разгортваньня самакрытыкі «ня гледзячы на асобы», замест рашучай барацьбы і адпору ўсякім бюракратычным элемэнтам, якія заціскалі самакрытыку, праводзілі антыпартыйную лінію, накіраваную на дыскрэдытацыю рабкораў, АК і АКК, праяўляючы прымірэнцкія адносіны да гэтых апартуністычных элемэнтаў, у радзе выпадкаў сваімі няправільнымі пастановамі адцягвалі ўвагу партарганізацыі ад задачы рашучае барацьбы з недахопамі на вытворчасьці і ў савецкім апараце, аб якіх рабкоры правільна сыгналізавалі праз друк і ў сваіх выступленьнях.

Бюро ЦК рашуча асуджае выступленьне сакратара АК т. Малаковіча на пленуме АК, у якім ён у адказ на правільную крытыку апартуністычных памылак Нова-Беліцкага райкому і патрабаваньне аб пераабраньні райкому, абвінаваціў ячэйку чыгуначнага палка і таварышоў, якія выступалі, у «левых» законах, што зьяўлясцца грубейшым парушэньнем унутрыпартыйнае дэмакратыі і заціскам самакрытыкі.

Бюро ЦК КП(б)Б прымае да ведама пастановы аб'яднанага пасяджэньня Бюро АК і АКК і аб'яднанага пленуму АК і АКК, якія прызналі і асудзілі дапушчаныя імі палітычныя памылкі ў галіне правядзеньня самакрытыкі і прапануе АК, райкомам і ячэйкам правесьці ўсе неабходныя меры да выпраўленьня дапушчаных палітычных памылак, мабілізаваць усю партарганізацыю на барацьбу з усялякага роду элемэнтамі заціску самакрытыкі і парушэньня ўнутрыпартыйнае дэмакратыі, а таксама праводзіць рашучую барацьбу з правааапартуністычнымі скажэньнямі ў рабоце судова-сьледчых органаў, забясьпечыць усе неабходныя ўмовы для разьвіцьця рабкораўскага руху і шырокага разгортваньня пралетарскае самакрытыкі.

Бюро даручае АК і Арг.-інструктарскаму аддзелу ЦК у тэрміновым парадку правесьці ў жыцьцё вызначаныя ЦКК мерапрыемствы па ўзмацненьні партыйнага кіраўніцтва ў гарадзкім і Нова-Беліцкім райкомах партыі.

Усебеларуская аргнарада пры ЦК КП(б)Б

АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ ПАРТЫЙНАГА АПАРАТУ

Спыніўшыся падрабязна на прычынах, выклікаўшых неабходнасьць перабудовы партаапарату, тав. **Гантман** кажа: знойдзецца, напэўна, нямала такіх з лягеру трацкістых якія паспрабуюць паспэкуляваць на нашай перабудове «ага, моў, казалі, што апарат ня згодзен кіраваць?»

Такім разважаньням трэба даць рашучы адпор. Наш партыйны апарат, не тэхнічны апарат, ён кіруе мільённымі масамі працоўных ён кіруе будаўніцтвам сацыялізму і ён стаіць на вышыні гэтых задач. Справа ідзе толькі аб лепшым прыстасаваньні яго работы да новых задач, аб большым прыцягненьні актыву да практычнай работы, аб узмацненьні тэмпаў работы.

З праверкай дырэктыў у нас да гэтага часу справа абстаяла дрэнна Была ў большасьці паперовая праверка. Зараз трэба будзе пэўную колькасьць актыву прыцягнуць да жывое праверкі выкананьня дырэктыў. Трэба будзе дабіцца значнага скарачэньня папіровай творчасьці разьмераў усялякіх рэзалюцый. Яны павінны будавацца коратка, на канкрэтных прапановах, каб іх мог зразумець кожны нізавы работнік.

Інструктаваньне павінна рабіцца ня толькі ў выглядзе праверкі, але і ў выглядзе дапамогі наладжаньню работы і мабілізацыі ўвагі партарганізацыі на вызьцьцё выкрытых недахопаў.

Ліквідацыя пасад жаноргаў і напработнікаў ні ў якім разе не павінна адбіцца на рабоце ў гэтых галінах. Работа сярод працоўных жанчын і нацменшасьцей павінна быць яшчэ больш узмоцнена.

Нам прыдзецца за лік скарачэньня апарату ЦК і АК узмацніць апараты сельрайкомаў і некаторых вытворчых ячэек. Гэта павінна стымуляваць лепшае палажэньне работы ў нізох у ячэйках.

Пры абгаварэньні праекту рэарганізацыі партапарату нарада пастанавіла пры **гарадзкіх РК** арганізаваць наступныя сэктары: арганізацыйна-інструктарскі, гаспадарчай работы, прафсыяньнай, паляпшэньня савецкага апарату, росту партыі, прапаганды і тэарытычнай падрыхтоўкі камуністых, па рабоце сярод работніц, па рабоце камсамолу, па садзейнічаньні калектывізацыі і вайсковы сэктар.

У кожным сэктары вылучаюцца ў парадку партнагрузкі кіраўнік і яго намесьнік з найбольш актыўных і вытрыманых партыйцаў, якія вызваляюцца ад іншых нагрузак. У склад кожнага сэктару трэба прыцягнуць 10—12 таварышоў з партактыву

Пры сельскіх РК нарада пастанавіла асобных сэктараў не ствараць, а прыцягваць найбольш актыўных камуністых да ўдзелу ў рабоце РК па поўных заданьнях на прапрацоўцы розных пытаньняў партыйнай, гаспадарчай і савецкай работы. Для практыкі пры 2 сельскіх РК вырашана арганізаваць сэктары калектывізацыі, савецкай работы, работы сярод батракоў і беднякоў, прафсаюзнай і культурна-масавай работы.

АБ ПЕРАБУДОВЕ ПАРТЫЙНАЙ І МАСАВАЙ РАБОТЫ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ

Перабудова партыйнай і масавай работы на прадпрыемствах,—кажа т. **Гаруновіч,**—павінна забясьпечыць мабілізацыю актыўнасьці рабочае клясы на выкананьне важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва, яшчэ большае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва, узмацненьне кіраўніцтва партыйнага калектыву на прадпрыемствах, паварот усёй партыйнай арганізацыі тварам да вытворчасьці шляхам пастаяннага ўдзелу ў выкананьні дырэктыў партыі па гаспадарчых пытаньнях. Трэба пашырыць сетку групавых партыйных арганізатараў з такім разьлікам, каб группарторг аб'яднаў ня больш 4—6 камуністых і 15—20 беспартыйных рабочых. Групавыя арганізатары павінны вылучацца ў брыгадзе, арцелі і інш. першапачатковых вытворчых адзінках з такім разьлікам, каб скласьці там пішавы трыкутнік з группарторга, брыгадзіра і прафдэлегата.

Пераход да сыстэмы сэктараў па асобных найбольш важных галінах работы ў партыйных ячэйках і калектывах прадпрыемстваў зьяўляецца найбольш мэтазгодным. Перавага сэктарнай сыстэмы ў тым, што яна забясьпечвае прыцягненьне да ўдзелу ў партрабоце масы актыву поўны абхоп усіх галін работы на прадпрыемстве, пастаяннае кіраўніцтва гэтай работай.

У больш буйных калектывах і ячэйках трэба арганізаваць прыблізна наступныя сэктары: гаспадарча-вытворчы, культурна-масавы, сэктар вучобы, агітацыі і друку росту партыі і работы сярод кандыдатаў, работы сярод моладзі, работы сярод жанчын (на прадпрыемствах, дзе большасьць жанчын, сэктараў па рабоце сярод жанчын не ўтвараць), падрыхтоўкі і вылучэньня кадраў, салдэйства калектывізацыі (у першую чаргу там, дзе больш рабочых зьвязана з вёскай).

У цэхавых ячэйках трэба ўтвараць наступныя сэктары: гаспадарча-вытворчы, вучобы, агітацыі, росту і работы з кандыдатамі, работы сярод моладзі або жанчын

Утварэньне сэктараў можа сябе апраўдаць толькі ў тым выпадку, калі ўсе партыйныя арганізацыі сур'ёзна адносяцца да гэтай работы і вылучаць лепшых партыйцаў-актывістых у якасьці загадчыкаў сэктараў і іх намесьнікаў, калі да работы ў сэктарох будзе прыцягнуты актыў, калі бюро ячэек будуць сачыць за работай сэктараў і аказваць ім штодзённую дапамогу.

Сыстэма сэктараў можа даць добрыя вынікі толькі тады, калі будзе адначасова перабудавана пановому работа прафсаюзаў і камсамолу, якія павінны сваю сетку будаваць прыблізна так, як і партыйныя органы. Адпатыповасьць структуры і арганізацыі работы прафсаюзаў, камсамолу і партыі дазволіць больш шпаркім тэмпам працаваць над выкананьнем вытворчых плянаў прадпрыемства, паднімаць узровень клясавай і палітычнай сьвядомасьці шырокіх колаў рабочых і ўтвараць новыя кадры партыйнага, камсамольскага і прафсаюзнага актыву.

Адносна прыстасаваньня грамадзкай работы да **бесьперапыннага** тыдню нарада выказалася за зьнішчэньне **10-цідзеннага** і ўстанаўленьне **12-цідзеннага** грамадзкага календара. Гэта дазволіць выкарыстаць выхадныя дні ўсім удзельнікам грамадзкай работы і складае лепшыя ўмовы для культурна-масавай работы і партыйнай вучобы.

АБ ЧАРГОВЫХ ЗАДАЧАХ ПАРТРАБОТЫ НА ВЁСЦЫ

Партработа на вёсцы,—кажа ў сваім дакладзе т. **Міцькоў,**—хаця і мае значныя дасягненьні, але яшчэ адстае і формай, і зьместам ад тых запатрабаваньняў, якія прад'яўляюцца задачамі калгаснага будаўніцтва і ліквідацыяй кулака, як клясы.

Адным з асноўных недахопаў у рабоце вясковых партарганізацый зьяўляецца зусім **нездавальняючая работа па арганізацыі батрацтва і беднаты.** Гэта работа вядзецца несыстэматычна. РК і ячэйкі ня кіруюць работай батрацка-бядняцкіх груп, не вядуць уліку работы гэтых груп. Большасьць АК нават ня маюць вестак, колькі ў іх акрузе ёсьць груп беднаты

Камсамольскія арганізацыі яшчэ прымаюць слабы ўдзел у вялікім руху за сацыялістычную перабудову сельскае гаспадаркі.

Тав. **Міцькоў** зварачае ўвагу на неабходнасьць узмацненьня работы сярод бядняцка-серадняцкіх мас жанчын і батрачак, бо сярод іх, як найбольш адсталай масы, кулак актыўна вядзе агітацыю супроць калгасу.

Ва многіх мясцох камуністыя не вялі належнай барацьбы з распродажам жывёлы, з распродажам маемасьці кулакоў. Былі асобныя выпадкі, калі самі камуністыя распрадавалі маемасьць. Старшыня Курганскага сельсавету камуністы **Шпакоўскі** раней, чым уступіць у калгас, прадаў свае будынкі і жывёлу.

Некаторыя вясковыя партарганізацыі не зразумелі палітычнай задачы ліквідацыі кулацтва, як клясы. Заўважвалася нерашучасьць пры правядзеньні гэтай справы, быў дапушчаны рад памылак. Асабліва заўважваецца гэта ў **Мазырскай** акрузе. Там рад парт'ячэек самі праводзілі раскулачваньне, прычым раскулачвалі... серадняковую.

Сярод некаторых камуністых пашыраны памылковыя настроі, што мы з кулаком закончылі ўжо барацьбу, што кулака няма, што ён ліквідаваны. Гэта палітычна-шкодныя настроі, з якімі трэба рашуча змагацца, бо яны дэмабілізуюць пільнасьць бядняцка-серадняцкіх мас і партарганізацый у барацьбе з кулацтвам.

Завастрыўшы ўвагу на слобым росьце арганізацыі ў 4-м квартале 1929 году за лік калгаснікаў беднякоў і батракоў пры адначасовым росьце арганізацый за лік сялян, тав. Міцькоў падрабязна асьвятляе пытаньне аб перабудове **сеткі парт'ячэек па вытворчым прынцыпе.**

Паводле гэтага праекту ў месячны тэрмін трэба пераглядзець існуючую сетку ячэек на вёсцы, арганізаваўшы ячэйкі пры саўгасах і калгасах, а пры немагчымасьці арганізацыі ячэек арганізаваць кандыдацкія групы. У буйных калгасах, якія аб'яднаюць па некалькі вёсак, неабходна арганізаваць партыйныя ячэйкі і кандыдацкія групы ў асобных вёсках (аддзяленьнях) калгасу, арганізоўваючы ў такіх выпадках партбюро ў цэнтры калгасу, дзе знаходзіцца праўленьне ўсяго калгасу.

У тых саўгасах і калгасах, а таксама аддзяленьнях калгасаў (вёсках), дзе немагчыма ўтварыць ячэйку і кандыдацкую групу, а ёсьць асобныя камуністыя, трэба вылучыць калгасных партарганізатараў. Партарганізатараў у калгасах і саўгасах трэба вылучаць таксама для правядзеньня работы сярод рабочых і калгаснікаў па асобных галінах гаспадаркі (паляводства, жывёлагадоўля і г. д.).

***

Тав. **Хацкевіч** у сваім судакладзе аб паляпшэньні работы савету ў сувязі з масавай калектывізацыяй зварачае ўвагу на важнасьць кампаніі перавыбараў саветаў у раёнах сацыяльнай калектывізацыі і чысткі тых саветаў, якія па сваім сацыяльным становішчы ня здольны праводзіць перабудову сельскае гаспадаркі.

Сельсаветы ў большасьці яшчэ ня сталі на чале масавага руху бядняцка-серадняцкіх мас вёскі за калектывізацыю, яны стаяць у бяку ад гэтага руху, плятуцца ў хвасьце. Асноўныя задачы саветаў у бягучы момант—стаць тварам да калгасу, ліквідаваць кулака, як клясу, узмацніць работу па арганізацыі беднаты.

Аб'яднаны пленум АК і АКК

Тав. **Хацкевіч** у сваім судакладзе аб паляпшэньні работы савету ў сувязі з масавай калектывізацыяй зварачае ўвагу на важнасьць кампаніі перавыбараў саветаў у раёнах сацыяльнай калектывізацыі і чысткі тых саветаў, якія па сваім сацыяльным становішчы ня здольны праводзіць перабудову сельскае гаспадаркі.

Сельсаветы ў большасьці яшчэ ня сталі на чале масавага руху бядняцка-серадняцкіх мас вёскі за калектывізацыю, яны стаяць у бяку ад гэтага руху, плятуцца ў хвасьце. Асноўныя задачы саветаў у бягучы момант—стаць тварам да калгасу, ліквідаваць кулака, як клясу, узмацніць работу па арганізацыі беднаты.

Пастанова агульнага сходу ячэйкі КП(б)Б Белдзяржвыдавецтва

Агульны сход ячэйкі КП(б)Б, заслухаўшы паведамленьне т. Курціка аб рэзалюцыях бюро ячэйкі ВДВ (ад 29 студзеня і 1 лютага), Бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б і пастанове аб'яднанага пасяджэньня бюро Менскага АК і прэзыдыуму АКК КП(б)Б, ухваляе цалкам далучыцца да гэтых рэзалюцый, як поўнасьцю забясьпечваючых адзінаства радоў камуністычнай партыі ў барацьбе за генэральную лінію партыі, супроць правага ўхілу і прымірэнцтва да яго, супроць нацыянал-апартунізму—аднэй з розна-выляданасьцяй правага ўхілу, у барацьбе супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, як найбольш небясьпечнага на даным этапе.

Выпэйпаказаньня рэзалюцыі даюць правільную бальшавіцкую ацэнку сутнасьці дапушчаных у часе сьвяткаваньня ў Менску юбілею ВДВ палітычных памылак, якія зьявіліся аб'ектыўнай дэманстрацыяй супроць партыі з нацыянал-дэмакратызмам і зьяўляюцца лёгічным працягам меншыхся і ранэй у выдавецкай дзейнасьці ВДВ буйнейшых палітычных памылак.

Агульны сход партыйнай ячэйкі, у дадатак да сваіх ранейшых пастаноў, ухваляе: 1) За дапушчэньне сыстэматычных палітычных памылак (палітрэдагаваньне і ўхвала для друку антысавецкай кніжкі Зарэцкага «Паларожжа на Новую Зямлю», нацыянал-дэмакратычныя памылкі ў часе работы рэдактарам «Савецкая Беларусь», прымірэнчыя адносіны да барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам, якія выразіліся ў поўным абходзе пытаньняў барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам ва ўступным слове на ўрачыстым пасяджэньні ў Доме Культуры, у змазаньні грамадзка-палітычнага значэньня юбілею, у нерашучых выступленьнях на агульным сходзе ячэйкі па пытаньнях барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам, змазаньне ва ўступнай прамове на ўрачыстым пасяджэньні палітычных прарываў у выдавецкай дзейнасьці ВДВ)—лічыць, што тав. Шыпіла павінен быць выключан з радоў камуністычнай партыі, але, прымаючы пад увагу поўнае і безагаворачае прызнаньне тав. Шыпілай палітычнай школьнасьці дапушчаных ім грубейшых палітычных памылак, а таксама яго рэвалюцыйнае мінулае, агульны сход ухваляе абмежаваецца суровай вымовай з папярэджаньнем і зьняць тав. Шыпіла з кіруючай работы. Ячэйка папераджае т. Шыпілу, што паўтарэньне ім у будучым якіх-небудзь яго ранейшых палітычных памылак павядзе за сабой безагаворачае выключэньне з партыі. 2) Тав Цьвікевічу, які, як

Дабіцца карэннага і хуткага пералому ў рабоце саветаў

Актыўнасьць батракоў, беднякоў і лепшых сераднякоў-калгасьнікаў накіруем на ўзмацненьне органаў пралетарскае дыктатуры на вёсцы

„Там, дзе саветы стаяць у баку ад калгаснага руху, трэба паставіць пытаньне аб новых выбарах у саветы. Там, дзе саветы не працуюць над згуртаваньнем батрацтва і беднаты, там ня можа быць забясьпечаны трывалы саюз з серадняком для ажыцьцяўленьня палітыкі ліквідацыі кулацтва і там таксама неабходна рубам паставіць пытаньне аб перавыбарах саветаў. Саветы, ня здольныя весьці рашучае барацьбы з кулацтвам, мы ня можам прызнаць такімі саветамі, якія справяцца з работаю кіраўніцтва калектывізацыяй вёскі, а таму і тут пытаньне аб перавыбарах павінна быць пастаўлена ў парадак дня". **(МОЛАТАЎ).**

Агенты клясавага ворага

Хатлянскі сельсавет аб'яднае 7 вёсак з агульнай колькасьцю 456 двароў. Калектывізацыя ў сельсавеце праходзіць зусім слаба. У сельсавеце панує хутарская і пасёлкавая сыстэма зямлякарыстаньня.

Плян правядзеньня веснавое пасеўнае кампаніі па сельсавеце яшчэ ня складзены. У падрыхтоўчую работу да веснавое слэбы бядняцкія масы ня ўцягнуты. Ачыстка насеньня амаль не праводзіцца. З некаторых бядняцкіх гаспадарак **за ачыстку насеньня спаганялася плата.**

Ня лепш пастаўлена справа і з спаганьнем с.-г. падатку. За кулацкімі і заможнымі гаспадаркамі лічыцца нядоімка па падатку **ў 1.300 руб.** Кулацкія гаспадаркі, якія маюць па 14 гэктараў зямлі, вызваляліся ад выплаты страхавых узносаў. Пры праверцы эканамічнага становішча гаспадарак выявілася, што ў групы беднаты залічваліся заможныя гаспадары, якія маюць па 8 гэкт. зямлі, шмат жывёлы і г д.

Лес адпускаўся кулацкім гаспадаркам, якія маюць па 15 гэкт. зямлі, па некалькі коняй, а пра беднату зусім ня дбалі.

Хатлянскі сельсавет адмовіў у водпуску лесу калгасу «Усход», які некалькі раз хадайнічаў аб гэтым.

Адна з важнейшых партыйных дырэктыў аб выніччэньні кулацтва, як клясы, па вёсках Хатлянскага сельсавету не знаходзіць свайго практычнага ажыцьцяўленьня. На тэрыторыі сельсавету ёсьць шмат такіх гаспадарак, якія, паводле свайго эканамічнага становішча, **трэба было-б** абкласьці ў індывідуальным парадку, але чамусьці гэта ня зроблена.

Кулакі паўтойвалі сваю маемасьць, жывёлу. Так, напрыклад, кулак Ламака Пятрусь плаціць падатак за адну карову ў той час, як у яго ёсьць 9 штук рагатае жывёлы. Прычым сельсавет выдаў гэтаму кулаку спраўку аб тым, што яму дазваляецца прадаваць жывёлу для выплаты с.-г. падатку.

Па некаторых вёсках па ініцыятыве членаў сельсавету і пры іх удзеле склікаюцца агульныя сходы заможнікаў сумесна з кулакамі, на якіх абгаворваецца пытаньне аб індывідуальным абкладаньні кулацтва. **Між тым, гэтае пытаньне наперад на бядняцкіх сходах не абгаворваецца.** Наогул сярод беднаты сельсавет ніякай работы не вядзе.

Калектывізацыя ў сельсавеце праходзіць без жаднага ўдзелу членаў сельсавету. З 20-ці членаў сельсавету ў калгасы ўступіла толькі 6 чалавек. Пераважная-ж большасьць замест дапамогі на сходах выступае супроць уступленьня сялянства ў калгасы.

Кулацтва вядзе злосную агітацыю супроць калгасаў, распускае розныя провакацыйныя чуткі, што ў калгасах будуць зьнішчаць дзяцей і г. д. Рашучага-ж адпору такім кулацкім вылазкам сельсавет не дае.

Дзеля таго, каб забясьпечыць правільнае правядзеньне лініі партыі і савецкае ўлады, **трэба ў самым тэрміновым парадку ачысьціць Хатлянскі сельсавет** ад чужога нам элементу, які знаходзіцца на службе ў клясавага ворага і перашкаджае калектывізацыі

М. САНДЛЕР.

Пралетарская дапамога сельсаветам

Менскі гарсавет ідзе па прыкладзе Віцебску

Некалькі дзён таму назад мы паведамлялі аб тым, што Віцебскі гарсавет, а таксама рабочыя заводу «Серп і Молат», члены Маскоўскага савету выклікалі Менскі гарсавет на сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае абслугоўваньне калгасаў і дапамогу сельскім саветам.

Старшыня Менскага гарадзкога савету тав. Аксючыц у гутарцы з нашым супрацоўнікам паведаміў аб мерапрыемствах Менскага гарсавету ў сувязі з выклікам серпамолатаўцаў і Віцебску.

Бурны тэмп калектывізацыі вёскі, — сказаў т. Аксючыц, — патрабуе, каб гарадзкія саветы аказалі сельскім саветам усямерную дапамогу ў іх практычнай рабоце.

Менскі гарсавет вітае прапанову Віцебскага савету і серпамолатаўцаў аб уступленьні гарсаветаў у сацспаборніцтва на лепшы ўдзел у калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

У сучасны момант Менскі гарсавет зварачае асаблівую ўвагу на ўзмацненьне работы прыгараднага сельсавету, тэрыторыя якога калектывізавана на 80 проц. У сельсавет накіраваны на работу чатыры члены гарсавету. Апрача таго да сельсаветаў прымацаваны адзін аграном.

Пленум гарсавету пастанавіў накіраваць у вёску на правядзеньне пасеўнай кампаніі **ня менш 50 дэпутатаў.** Гэта дапамога будзе аказвацца вёсцы на працягу ўсяго году шляхам зьмяньнальнасьці брыгад дэпутатаў. Дэпутаты выедуць у раёны не пазьней 10-га лютага.

Савет вырашыў таксама прыняць шэфства пад адным з раёнаў і выклікаў па спаборніцтва па калектывізацыі вёскі Гомельскі і Бабруйскі гарадзкія саветы.

На бліжэйшым пасяджэньні гарсавету будзе заслуханы даклад аб падыходзячай рабоце савету і аб яго ўдзеле ў дапамозе сельскім саветам.

Выгнаць кулакоў з Дзяміхоўскага сельсавету

Дзяміхоўскі сельсавет, Рэчыцкага раёну, на чале **з старшынёю Кацуба,** не праводзіць у сваёй практычнай рабоце правільнай клясавай лініі. Сельсавет не выкарыстоўвае ініцыятывы вясковых актывістых для перабудовы вёскі на новы лад.

У той час, калі мы практычна ставім пытаньне аб выніччэньні кулацтва, як клясы, на пашыраным пленуме Дзяміхоўскага сельсавету старшыня Кацуба ў «бягучых справах» хадайнічае аб адноўленьні ў выбарчых правах кулакоў і нэпманаў. І толькі пад націскам беднаты Кацуба для адводу вачэй галасаваў супроць наданьня выбарчых правоў пазбаўленым.

Сам старшыня сельсавету Кацуба— кулак, ён робіць шкодны ўплыў на беднату і серадняцкія масы. Калі на сходзе ў вёсцы Козьзе выступіў супроць калектывізацыі кулак Дашонак, які мае 5 коняй, то Кацуба ня толькі не асадзіў гэтага клясавага ворага, а наадварот, пачаў бараніць Дашонка, як серадняка. Толькі па прапанове беднаты, наперакор жаданьням старшыні сельсавету Кацубы, кулак Дашонак быў абкладзены ў індывідуальным парадку.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што Дзяміхоўскі сельсавет пры цяперашнім яго складзе ня здолеў праводзіць лініі партыі і савецкае ўлады на вёсцы. Трэба зараз-жа адклікаць са складу гэтага сельсавету ўсіх падкулачнікаў і паслаць туды на работу батракоў і беднату.

У. Н.

АБАРОНЦЫ КУЛАКОЎ У ГОРНАЎСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ

Горнаўскі сельсавет (Плешчаніцкі раён) засьмечаны клясава-варожым элементам. Так, напрыклад, член прэзыдыуму сельсавету **Еляневіч М.** выступае супроць калектывізацыі. Ён — рядзкі прыхільнік кулацтва і арганізатар яго. У вёсцы Чарэнаўшчыны Еляневіч склікаў таемныя сходы, на якіх агітаваў супроць калектывізацыі і абагуленьня маемасьці і пасеньня. Еляневіч сарваў два сялянскія сходы.

Ад такое шкодніцкае работы гэтага кулацкага прыхільніка калектывізацыя ў Горнаўскім сельсавеце праходзіць вельмі слаба. Не адпавядае свайму прызначэньню і член сельсавету **Гунько Зося,** якая мае сувязь з папамі і сьпявае ў царкве. Гунько ніякае грамадзкае работы ў сельсавеце не вядзе.

Ня лепш трымае сябе і трэці член сельсавету **Жук Мікола.** Ён таксама заяўлены абаронца кулацтва. Зрабіў фіктыўны падзел маемасьці з сваім бацькам. Жук прысвоіў сабае сабраныя ў вёсцы Печнае грошы на трэцюю пазыку індустрыялізацыі, за што справа аб ім перадана ў народны суд.

Ясна, што такія элемэнты ня здольны праводзіць усе мерапрыемствы савецкае ўлады на вёсцы. Усе гэтыя шкоднікі павінны быць зараз-жа выкінуты са складу Горнаўскага сельсавету.

К.

ШКАДУЮЦЬ КУЛАКА

ВІЦЕБСК (наш кар.). Ня гледзячы на тое, што кулацтва ў радзе месц вядзе шкодную контр-рэвалюцыйную агітацыю супроць калгасаў і нават выступае адкрыта супроць калгасьнікаў шляхам пад палаў і тэрору, ёсьць яшчэ такія куткі, дзе кулака шкадуюць, дапамагаюць яму.

Так, у Ганькаўскім сельсавеце, Бешанковіцкага раёну, кулак Жыгун быў ападаткаваны індывідуальна, а падатковая камісія РВК яго ад гэтага вызваліла. Сакратар Котаўскага сельсавету Гаўрыленка (Сураскі раён) таксама вызваляе кулакоў ад падатку. Тлумачыцца гэта тым, што ён сам заможнік.

Ня дзіва, што пры такіх «сельсаветчыках» кулакі ў вышэйпаказаных раёнах разышліся ва ўсю. У вёсцы Пятніцкая, Каўлякоўскага сельсавету, кулакі і былыя эсэры Пушнякоў і Бокін награжаюць беднаце падпалам. У вёсцы Ржаўка, Біклоскага сельсавету кулакі падпалілі каапэрацыйныя сьвірны, ледзь удалося ліквідаваць пажар. У Віцебскім раёне бандыт-кулак Каралькоў праз сваіх агентаў зрабіў напад на старшыню Віцебскага сельсавету.

Ня гледзячы на кулацкія пагрозы і пасьпыхаць раду сельсаветаў, бядняцка-сераднякае сялянства Бешанковіцкага, Віцебскага і Сураскага раёнаў рашуча ўступае ў калгасы. За апошні тыдзень аформлена 14 новых калгасаў з плошчай ад 1.000 да 2.000 гэкт. кожны. На сходах, якія адбыліся, беднота патрабуе высяленьня кулацтва і адабраньня ад яго зямлі і сродкаў вытворчасьці.

На сходзе ў менскіх друкароў

Клюб друкароў сёньня неяк асабліва ўпрыгожаны. На вытворчай выстаўцы паказаны выраб прадукцыі машыннага цэху. Хто раней бачыў вытворчыя выстаўкі пераканаўся, што ў галіне паляпшэньня якасьці працы ёсьць значныя посьпехі. Прамфінплян перавыкананы на 8 проц. І ня дзіва. Машынны цэх паўтара месяца таму назад абвясьціў сябе ўдарным. Зьмяніліся ў параўнаньні з мінулым кварталам прагулы, спазьненьні на работу. Машынны цэх сапраўды паказвае, што ён ударны.

Тав. **Фэльдман**—сакратар машыннай цэхічэйкі. Хланец зусім малады, але мае ўжо за плячыма 10-гадовы камсамольскі стаж і 6-гадовы партыйны стаж. Адкрываючы сход т. Фэльдман характарызуе тыя посьпехі, якія машынны цэх мае з таго часу, як абвясьціў сябе ўдарным.

У прэзыдыум абіраюцца лепшыя ўдарнікі машыннага цэху.

З дакладам: «Новае ў рабочай клясе і нашы задачы» выступіў сакратар МенАК КП(б)Б т. **Славінскі,** якога рабочыя сустрэлі бурнымі апладысмэнтамі. Ясна і проста т. Славінскі гаворыць.—Трэба усю нашу ўвагу, усе нашы сілы накіраваць на выкананьне пяцігодкі, перабудаваць на новы сацыялістычны лад сельскую гаспадарку. Рабочым, якія ўступаюць у партыю, трэба яшчэ з большым напружаньнем працаваць для паляпшэньня вытворчасьці, працаваць над сабой, каб падняць свой палітычны ўзровень, весьці за сабой працоўнае сялянства.

Выступае дырэктар заводакіраўніцтва т. Сянчук, сам рабочы. «Прамфінплян. —кажа т. Сянчук.—на нашым прадпрыемстве перавыкананы. Аднак, у нас ёсьць прарыў па зьніжэньні сабекошту. Мы па пляне на 40 проц. адсталі па зьніжэньні сабекошту. Адміністрацыя-тэхнічнаму пэрсаналу разам з рабочымі трэба гэта прарыў выправіць».

Тав. **Крэйнін** ад імя групы рабочых машыннага цэху заяўляе, што прынятыя на сябе абавязкі рабочыя ўдарнікі выконваюць, але гэтага мала. Яны ня хочуць быць па-за радамі ленінскае партыі. Яны просяць бюро цэхячэйкі прыняць іх у рады партыі. Пасьля Крэйніна выступае **т. Альтман** таксама з заявай ад групы рабочых. Тав. **Каплан,** тав. Каўрыгін—ад групы чорнарабочых —усе з заявамі прыняць іх у рады ленінскае партыі.

Тав. **Нісонс,** які выступае ад імя 20 рабочых пераплётчыкаў, зачытаў заяву аб уступленьні ў партыю. Тав. Нісонс кінуў лёзунг—«ад камуністычнага цэху да камуністычнай друкарні». Гэты лёзунг рабочыя друкарні сустрэлі бурнымі воплескамі.

Выступае яшчэ рад рабочых з заявамі аб уступленьні ў партыю.

Сёньня гістарычны вечар для друкароў. Яшчэ ніколі ня было такога энтузіязму ў рабочых-друкароў. Сыплюцца заявы ў прэзыдыум сходу ад асобных рабочых з просьбай прыняць іх у рады партыі. Абяцаюць з гонарам несьці імя камуністага і апраўдаць гэту годнасьць.

Тав. **Каждан,** сакратар парткалектыву, кажа, што мы сёньня зьяўляемся сьведкамі, калі ў нас рабочыя пасьледнялі прыкладу каломенскіх рабочых. Гэта ад нас вымагае яшчэ большае ўвагі, яшчэ большае энэргіі, каб сапраўды выхоўваць рабочых у камуністычным напрамку. Мы, як і дагэтуль, з гэтай задачай справімся. Той пералом, які мы маем на нашым прадпрыемстве, гаворыць аб тым аўтарытэце, які партыя мае, дзякуючы пасьпяховаму выкананьню пяцігадовага пляну, выкарчоўваньню капіталістычных элемэнтаў у горадзе і ліквідацыі кулацтва, як клясы, у вёсцы.

Пералом, які ёсьць зараз у нашай рабоце, мы замацуем.

Ад АПАД ЦК КП(б)Б выступіў тав. **Будзінскі.**

І. Р—н.

Да 12-ай гадавіны РСЧА

Падыходзячая 12-я гадавіна РСЧА адбываецца ў абставінах вялікіх посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва, вялізарнейшых дасягненьняў у галіне рэканструкцыі прамысловасьці і сельскае гаспадаркі і ўпартай барацьбы за выкарчоўваньне рэштак капіталістычных элемэнтаў у нашай краіне.

Нашы посьпехі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, натуральна, выклікаюць абвастрэньне клясавай барацьбы ўнутры краіны, узмацненьне варожых дзеяньняў буржуазіі на Захадзе і, як вынік — шалёную кампанію імпэрыялістых супроць СССР, якія рыхтуюць новую пагрозу нападу на Савецкі Саюз.

Пралетарскія масы заўсёды разам з Чырвонай арміяй адзначаюць яе гадавіну з тым, каб яшчэ больш замацаваць сувязь і скапцентраваць сваю ўвагу на пытаньнях умацаваньня абароназдольнасьці нашай краіны. Вялікі творчы ўздым працоўных да задач мірнага будаўніцтва краіны павінен быць адпаведным чынам скарыстаны і на выраўнаньне задач умацаваньня абароны.

Сьвяткаваньне павінна быць асабліва скарыстана для ўзмацненьня пралетарскага ўплыву на Чырвоную армію. Абвастрэньне клясавай барацьбы ў краіне, палітыка партыі ў справе ліквідацыі кулацтва, як клясы, ставяць задачу аб яшчэ большым узмацненьні пралетарскае ўвагі з мэтаю дапамагаць партыйна-палітычнай рабоце па выхаваньні нашага чырвонаармейца-селяніна ў духу барацьбы з прыватна-ўласьніцкай псыхалёгіяй і за выкоўваньне з яго самаадданага барацьбіта за будаўніцтва сацыялізму.

Арганізацыі Асоавіяхіму павінны шырока скарыстаць гэту гадавіну з мэтаю ўзмацненьня росту сваіх радоў, большага разгортваньня кампаніі па рэалізацыі білетаў 4-й асоавіяхімаўскай лётарэі і ўзмацніць распаўсюджаньне вайсковай літаратуры.

Часьцям Чырвонай арміі, арганізацыям Асоавіяхіму, дакладчыкам аб гадавіне РСЧА трэба будзе асаблівую увагу зьвярнуць на растлумачэньне характару сучаснай вайны, **якая патрабуе ня толькі аднэй гатоўнасьці да барацьбы, але і пазярэдняй падрыхтоўкі мас у справе ўменьня дастасаваць свае сілы і веды для перамогі над ворагам.**

Гадавіна павінна быць стымулам узмацненьня сацыялістычнага спаборніцтва паміж часьцямі Чырвонай арміі і сваімі шэфамі, грамадзянскімі ячэйкамі Асоавіяхіму і вайсковымі.

Газам з гадавінаю РСЧА сьвяткуецца і 10-цігодзьдзе існаваньня 1-й конной арміі, якое ня можа не знайсьці свайго адлюстраваньня ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый.

Усю падрыхтоўку і сьвяткаваньне 12-й гадавіны РСЧА правесьці пад знакам мабілізацыі ўвагі працоўных вакол пытаньняў абароны краіны, выхаваньня гатоўнасьці грудзьмі стаць за Савецкі Саюз і сусьветную пралетарскую рэвалюцыю.

М.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Настаўнікі абвясьцілі сябе мабілізаванымі

РЭЧЫЦА. (Наш кар.). Раённая канфэрэнцыя настаўніцтва Рэчыцкага раёну абвясьціла сябе мабілізаванай на пэрыяд веснавое пасеўнае кампаніі і пастанавіла адлічыць 1 проц. месячнага заработку на купілю трактару «Гомельскі Асьветнік».

Пад суд—за бязьдзейнасьць

БАБРУЙСК (Наш кар.) За бязьдзейнасьць у справе загатоўкі гатункованага насеньня адданы пад суд старшыня Сьвіслацкага крэдытнага т-ва.

Суд над кулакамі, якія распрадаюць жывёлу

ВІЦЕБСК (Наш кар.). За апошні тыдзень праведзены рад працэсаў над кулакамі, якія распрадаюць жывёлу. У Сіроцінскім раёне засуджаны на два гады пазбаўленьня волі і да высылкі на 5 год з канфіскацыяй усе маемасьці поп Каваленка і кулак Мажэйко. У Віцебскім раёне засуджаны 4 кулакі, у яных канфіскаваць ўся маемасьць.

Калектывізацыя па Бабруйшчыне

БАБРУЙСК. (Наш кар.). На 1-га лютага па Бабруйшчыне арганізаваны 534 калгасы. Калгасамі ахоплена 30 проц. усіх двароў і 34,5 проц. ворнай зямлі ў акрузе. Жывёла ў калгасах абагулена на 22,3 проц

Муніцыпалізавана 530 дамоў

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У горадзе муніцыпалізавана 530 прыватных дамоў. Да 15-га лютага будзе праведзена высяленьне з муніцыпалізаваных дамоў непрацоўнага элемэнту.

Праведзена мабілізацыя работнікаў аптыпрацаў жылсаюзу, акрфінадзелу і адмадзелу для ўзяку жыхароў новых дамоў камгасу і спаганьня запазычанасьці з былых дамаўласьнікаў.

Пленум Віцебскага акругкому

ВІЦЕБСК (наш кар.). Скончыў работу пленум акругкому КП(б)Б. Сакратаром акругкому выбраны тав. Чычэраў, рабочы-мэталісты, член партыі з 1911 году.

Пленум АК віталі рабочыя швэйнае фабрыкі «Прафінтэрн», мэталістыя, чыгуначнікі, якія абяцалі поўнасьцю выканаць прамфінплян на 1929-30 год.

Паўторная чыстка Сеньненскай партарганізацыі

ВІЦЕБСК (наш кар.). У сувязі з выкрыцьцём раду фактаў заціску самакрытыкі ў г. Сенна, бюро АК і прэзыдыум АКК пастанавілі правесьці паўторную чыстку Сеньненскай гарадзкой партарганізацыі. Старшыня Сеньненскага РВК тав. **Гнеўка** зьняты з работы.

Каморвікаў—у калгасы

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Акрэмандзел выслаў на раёны 96 зямляўпарадкавацеляў. Кожнаму з іх дана заданьне зямляўпарадкаваць 7.500 гэкт. у нова арганізаваных калгасах.

МЕНСК

Прыезд дэлегацыі Усесаюзнай Акадэміі Навук

У Менск прыехала дэлегацыя Ўсесаюзнай Акадэміі Навук у складзе старшыні ленінградзкай сэкцыі навуковых працаўніковў ЗЯЛЁНКІ, акадэміка САМАЙЛОВІЧА і асыстэнта ПРУЖЫНСКАЙ для прапрацоўкі дагавору сацыялістычнага спаборніцтва з Беларускай Акадэміяй Навук.

Адначасова дэлегацыя Ўсесаюзнай Акадэміі Навук азнаёміцца з работаю найбольш буйных культурных устаноў Менску.

3.000 руб. на пабудову трактарнай калёны

Менскія чыгуначнікі сабралі каля 3.000 руб. на пабудову трактарнай калёны. Чыгуначнікі прынялі шэфства над Смалявіцкім і Грэскім раёнамі, куды накіравана брыгада з 20 чал.

Пачаліся заняткі на горных курсах ВСНГ

1-га лютага распачаліся заняткі на горных курсах ВСНГ. Усяго на курсы прынята 50 чал., большасьць якіх—рабочыя. Для 30 студэнтаў вызначаны стыпэндыі ў разьмеры 50 руб. у месяц. Курсы забясьпечаны поўным складам лектараў.

Курсы рацыяналізатараў

5-га лютага ў Менску адкрыліся курсы рацыяналізатараў пры ВСНГБ. На курсах навучаецца 57 чалавек, галоўным чынам, рабочых з вытворчасьці са стажам ня менш 5 год. Тэрмін навучаньня —4 месяцы. Курсанты атрымліваюць стыпэндыі па 100 руб. ад трэстаў з захаваньнем заработку па месцы службы.

Да 1931 г. поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць

У Менску адкрылася нарада таварыства «Прэч няпісьменнасьць». Учора на нарадзе быў заслуханы плян Наркамасьветы па ліквідацыі няпісьменнасьці ў БССР.

Плян прадугледжвае ліквідацыю няпісьменнасьці ка працягу 1931 году, сярод усяго няпісьменнага насельніцтва Беларусі ва ўзросьце ад 12 да 45 год і сярод рабочых ад 12 да 50 год. Плян прадугледжвае дасканалы ўлік усіх няпісьменных.

Па дзяржбюджэце для выкананьня пляну асыгнуецца звыш 2 з палавой мільёнаў руб. Грамадзянасьць таксама дасьць звыш 2-х мільёнаў руб. У 1931 годзе на ліквпунктах будзе навучацца звыш 40 тысяч малапісьменных.

На нарадзе заслуханы таксама даклады аб рабоце раду акруговых т-ваў «Прэч няпісьменнасьць».

Цэны на прамтавары зьніжаюцца на 5 проц.

Наркамгандаль БССР і Белрабсэкцыя запрапанавалі ўсім ЦРК зьнізіць цэны на 5 проц. супроць цэн на 1-га кастрычніка 1929 году на наступныя групы тавараў: баваўняныя вырабы, шарсьцяныя, абутак (за выключэньнем шаўровага, лакавага і замшавага), галёшы, бялізну, гатовае адзеньне (за выключэньнем мужчынскага і жаночага паліто на мяху), селядцы, мыла гаспадарчае і расьліннае масла.

Новыя цэны павінны быць уведзены не пазьней 10 лютага.

Навіны МЦРК

10-га лютага МЦРК пачынае адпускаць па дзіцячых кніжках масла па 150 грам на дзіця і манну па 500 грам на дзіця.

***

У бліжэйшыя дні ў МЦРК прыбудзе **мануфактура.** На працягу лютага і сакавіка месяцаў будзе дастаўлена 17 вагонаў баваўнянае тканіны, якая паступіць у продаж па нармальнай і павышанай цане.

МЦРК аднавіў продаж мануфактуры ў магазыне № 45 (Савецкая вул. супроць кіно «Чырвоная Зорка»).

Зьмены ў апараце ЦВК

Пастановай Сакратарыяту Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР т. Будзін аслабонены ад абавязкаў аткаванага сакратара Нацыянальнай Камісіі ЦВК БССР; тав. Лукашэвіч—ад абавязкаў час. вык. абав. загатчыка арганадзелу прэзыдыуму ЦВК БССР. Абодва яны камандураваны на стэлую працу ў калгасы.

Пастанова літзгуртаваньня „Узвышша"

У «Зьвязьдзе» № 296 зьмешчан артыкул «Лісты рэнэгата», які характарызуе Фэлікса Купцэвіча, як нацыянал-дэмакрата і антысэміта.

Літаратурна-мастацкае згуртаваньне «Узвышша», разгледзеўшы гэтае пытаньне на агульным сходзе сваіх сяброў і лічачы несумяшчальным яго прабываньне ў пралетарскім згуртаваньні — **выключыла Фэлікса Купцэвіча з ліку сваіх сяброў.**

Беларускае літаратурна-мастацкае згуртаваньне «Узвышша».

Зямельныя органы слаба вядуць барацьбу са зьнішчэньнем жывёлы

Пры патураньні, а часамі пры садзейнічаньні сельсаветаў і загатоўчых арганізацый забой і распродаж жывёлы працягваецца

Прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зьнішчэньні жывёлы!

За дробязямі ня бачаць галоўнага

Што практычна робяць шматлікія адказныя працаўнікі зямельных і калгасных органаў у сэнсе ажыцьцяўленьня задач, якія ставіць перад імі месячнік жывёлагадоўлі?

Увогуле займаюцца дробязямі, дырэктывамі, інструкцыямі. Галоўнага не заўважваюць, галоўнае не ставіцца на абмеркаваньне шырокіх мас калгасьнікаў, батракоў і беднаты.

Вось факты. У калгасе «Рудня-Шлягін», Веткаўскага раёну, Гомельскае акругі, засталося толькі 30 авечак. Зусім нядаўна было звыш 450. Калгас «Рудня-Шлягін» не адзінкавы. Некаторыя спэцыялістыя трымаюцца тае думкі, што авечкі Беларусі не патрэбны і што яны ня маюць перспэктыў на разьвіцьцё ў нашай рэспубліцы.

Паўтараецца гісторыя з коньмі, якой нядаўна мы займаліся. Гаворыць, што авечкі ў нашых умовах не [illegible] адсюль і масавае зьнішчэньне авечак. Да рэчы, у калгасах авечкі або ня ўлічваюцца зусім, або ўлічваюцца ў апошнюю чаргу.

Лёс авечкі падзяляюць і цяляты. Забой цялят у вёсцы некалькі, праўда, зьнізіўся, але затое значна павялічылася зьнішчэньне маладняка ў гарадох. За адзін мінулы месяц у Бабруйску, напрыклад, было забіта каля 2.500 цялят. **Ніякага адбору цялят на бойнях няма.** Характэрна, што загадчыкі бойнямі не перашкаджаюць зьнішчэньню маладняка. Загадчык бабруйскай бойняй заявіў, што ён ніякіх загадаў аб адборы цялят не атрымліваў і таму лічыць нармальным існуючае становішча. У гарадох ня спыняецца забой і буйное рагатае жывёлы. Кулак адаслаў рагатае жывёлы. [illegible] сваіх знаёмых нэпманаў, якія і рэжуць жывёлу. Гарсаветам надана права канфіскаваць жывёлу і маемасьць нэпманаў **за злоснае зьнішчэньне жывёлы.** Аднак, гэтая пастанова слаба праводзіцца ў жыцьцё.

Адбор жывёлы для ўкамплектаваньня калгасаў усё яшчэ праходзіць нездавальняюча. Мы маем шмат выпадкаў, калі жывёла ставіцца ў разрад прадукцыйнае толькі таму, што яна такая худая, што няпрыгодна на мяса.

Калгасы і саўгасы БССР павінны паставіць на адкорм каля 60 тыс. сьвіней і 20.000 кароў. **Да гэтага часу пастаўлена толькі некалькі тысяч сьвіней і кароў.**

Зусім у цяні засталіся пытаньні птушкаводзтва. На рынкі птушка выкідаецца тысячамі. Характэрна, што прапанова птушкі перавышае попыт. Ніякіх канкрэтных мер да спыненьня павальнага зьнішчэньня птушкі ніхто ня ўжывае.

Спажывецкая каапэрацыя ў гарадох не выяўляе ініцыятывы ў справе арганізацыі птушка-адкормачных пунктаў, у той час, як гэта вельмі лёгка было-б зрабіць: для адкорму можна з посьпехам выкарыстоўваць адкіды шматлікіх сталозых і бойняў.

Становішча з птушкаводзтвам стварылася такое, што калі ў самы бліжэйшы тэрмін ня будуць ужыты рашучыя меры, дык птушкаводзтва, як важная экспартная галіна сельскае гаспадаркі БССР, праз некалькі месяцаў ня будзе існаваць.

Усе гэтыя нездаровыя пытаньні жывёлагадоўлі амаль зусім не закрануты у часе месячніка жывёлагадоўлі, які зараз праводзіцца па БССР.

В.

Сельсаветы, якія дапамагаюць зьнішчэньню жывёлы

Абвостраная клясавая барацьба ў вёсцы ў сувязі з шпарка разгорнутым тэмпам калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, патрабуе ад сельсаветаў выразнай клясавай лініі ў штодзённай рабоце. Але, на жаль, на многіх сельсаветам мы гэтага ня бачым.

Калі ў вёсцы Бардзіваўка 1-й, Хайкаўскага сельсавету, Самахвалавіцкага раёну, быў затрыманы кулак Перапеча, які вёў прадаваць сваю жывёлу, то Вузьлянскі сельсавет пашоў яму на выручку. Старшыня сельсавету Юркевіч і член Галабурда выдалі гэтаму кулаку фіктыўную спраўку, нібы Перапеча вёў жывёлу не на прадаж, а сваёй замужняй дачцы ў другую вёску, якой гэта жывёла і належала.

Авось прыклад з дзейнасьці членаў Трасьцянскага сельсавету. Калі нядаўна Бардзіваўская жывёлагадоўчая арцель затрымала сальніка Шчарбовіча, які скуплёў сьвіней у сялян для спекуляцыі, то Трасьцянскі сельсавет, замест прыцягненьня гэтага кулака да адказнасьці, выдае яму спраўку, што нібы Шчарбовіч ніколі не гандляваў і не гандлюе сьвінямі, а зараз закупіў сьвіней для сваёй патрэбы.

Член Кайкаўскага сельсавету Бандыла А., у часе калектывізацыі імкнуўся зрываць сходы, перашкаджае калектывізацыі.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што некаторыя нашы сельсаветы засьмечаны людзьмі.

Ударнікі.

Забой жывёлы ня спыняецца

Ня гледзячы на цэлы рад дырэктыў нашых вышэйшых партыйных і савецкіх органаў аб тым, каб у корані спынець злачынны забой і распродаж жывёлы, на мясцох рад работнікаў нічога ня робіць у гэтым напрамку і нават патураюць і спрыяюць кулаку.

Гэтаму спрыяе яшчэ і такая акалічнасьць, што на мясцох няправільна зразумелі дырэктыву партыі і лічаць, што ў калгасах трэба аграмаджваць толькі буйную жывёлу. Ад такога «тлумачэньня» на станоў нашых вышэйшых органаў, мы маем цэлы рад ненармальных нават злачынных зьнішчэньняў пры абагульваньні жывёлы ў калгасах.

Так, члены калгасу «Рудня-Шмягін», Веткаўскага раёну, да ўступленьня ў калгас мелі 450 авец, а пасьля ўступленьня—толькі 30.

У вёсцы Арэвічы, Хойніцкага раёну, да арганізацыі калгасу было 480 кароў, а пасьля арганізацыі засталося толькі 50. Рэшта парэзана і распрадана. Ні сельсаветы, ні калгасаюз не вядуць барацьбы з зьнішчэньнем жывёлы. Тут бязумоўна шмат у чым вінавата і гандлёвая палітыка Наркамгандалю. Так, напрыклад, Менскім акргандлем з усёй закупленай жывёлы толькі 10 проц. адабрана для калгасаў і саўгасаў. Мелі месца і такія факты, калі жывёла залічвалася ў разрад прадукцыйнай толькі таму, што яна худая і таму няпрыгодна для мяса.

Маладняк у тэй-жа Менскай акрузе паступае на рынак у вялікай колькасьці і ўвесь зьнішчаецца.

Справа адкорму жывёлы пастаўлена ў нас зусім дрэна. Так, Менскае аддзяленьне Белкаапсаюзу займаецца адкормам сьвіней усяго да 7-9 пуд. вагі. У той час, як забойную вагу можна павялічыць да 12-16 пуд.

Вывады з усяго гэтага напрошваюцца самі. Нам трэба ўзмацніць работу па захаваньні жывёлы ў бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

Трэба спыніць злачыннае зьнішчэньне маладняка і заняцца вырошчваньнем яго. Балвым парадкам павесьці работу па абагульваньні ўсёй жывёлы і птушак у калгасах. Мы павінны ва ўвесь рост паставіць праблему вырошчваньня ўсяго маладняка. Трэба павялічыць прадукцыйны эфэкт—мясны і малочны нашае жывёлагадоўлі праз лепшую пастаноўку адкорму жывёлы, шляхам зьбіраньня для гэтай мэты ўсіх адкідаў, праз лепшую пастаноўку харчаваньня малочнае жывёлы.

Мы павінны павярнуць нашу гандлёвую палітыку на вытворчыя рэйкі, каб гандлёвыя арганізацыі ў першую чаргу дбалі аб інтарэсах жывёлагадоўлі, а потым ужо аб гандлі, трэба, каб яны думалі і аб патрэбах нашага заўтрашняга дня.

Бяз гэтага мы станем перад пагрозай што нашы часовыя мясныя затрудненьні могуць абрынуцца ў працяжны мясны голад.

Больш увагі мясной праблеме. Трэба перавесьці нашу жывёлагадоўлю на сацыялістычныя рэйкі, трэба пабудаваць буйныя фабрыкі мяса і малака. Толькі такім спосабам мы пераможам на гэтым фронце

І. МАРКАЎ.

Каго трэба пасылаць на курорты і ў санаторыі

Прэзыдыум ЦСПСБ прапанаваў Галоўсацстраху не пазней сакавіка скласьці плян санаторна-курортнай кампаніі на веснавы і летні пэрыяд г. г.

У мінулым годзе ня ўсе округі выканалі дырэктыву аб накіраваньні на курорты і санаторы 80 проц. рабочых і 20 проц. служачых. Напрыклад, Аршанская акруга паслала ў мясцовыя санаторы толькі 65 проц. рабочых і 35 проц. служачых. Мазырская акруга паслала 59 проц. рабочых і 41 проц. служачых.

Прэзыдыум ЦСПСБ прапанаваў Галоўсацстраху, пад асабістую адказнасьць старшынь страхкас, строга сачыць за тым, каб **пры накіраваньні на курорты і санаторы, а таксама ў дамы адпачынку абавязкова захоўваць прапорцыю—80 проц. рабочых ад варштату і 20 проц. служачых.**

Другі недахоп у леташняй кампаніі: застрахаваных пасылалі на курорты, абыходзячы доктарска-кантрольныя камісіі.

Зараз прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў, **каб усе застрахаваныя, якія едуць на курорты за кошт прафсаюзаў і нават за свой кошт, але прымушаны карыстацца дапамогай страхкас, наперад праходзілі праз доктарска-кантрольныя камісіі.**

У мэтах лепшага абслугоўваньня адпачываючых, прэзыдыум ЦСПСБ выказаўся **за пабудову буйных міжакруговых дамоў адпачынку:** аднаго ў Гомелі—для абслугоўваньня застрахаваных Гомельскай, Бабруйскай, Мазырскай акруг і аднаго ў Віцебску для Віцебскай, Полацкай, Аршанскай і Магілеўскай округ.

МЯДЗЬВЕДЖАЯ ЛАСКА МЦРК

(ЯК ЦРК КРЭДЫТУЕ ПАЙШЧЫКАЎ РАДЫЁ-АПАРАТУРАЙ)

За апошні час наглядаецца масавае набыцьцё радыё-прыёмнікаў рабочымі і служачымі. ЦРК адпускае радыё-апаратуру сваім пайшчыкам у крэдыт тэрмінам на 4 месяцы.

Ужо два дні, як ЦРК прадае радыё-апаратуру **на 10 проц. даражэй,** чым Дзяржшвэймашына і Белкаапсаюз. ЦРК самавольна парушыў цэны, устаноўленыя Наркамгандлем на радыё-апаратуру для ўсяго Савецкага Саюзу. Мы катэгарычна адмаўляемся ад такое сыстэмы забесьпячэньня пайшчыкаў радыё, прычым лічым недапушчальным парушэньне цьвёрдых цэн ЦРК.

РСІ і Наркамгандлю трэба зацікавіцца, чаму Менскі ЦРК **самавольна** павысіў на 10 проц. цэны на радыё-апаратуру.

Радыё-слухач.

Калгас імя СНК БССР

На тэрыторыі Возерскага сельсавету, Самахвалавіцкага раёну, Менскае акругі, арганізаваўся калгас імя СНК БССР на плошчы 5.000 гэкт.

Першая канфэрэнцыя калгасьнікаў Возерскага сельсавету паслала прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Курсы кніжнікаў для калгасаў

У сакавіку Белкаапсаюз адкрывае стыднёвыя курсы для падрыхтоўкі прадаўцоў кніг у калгасах і саўгасах. На курсы будуць прымацца выключна работнікі, якія вылучаны калгасамі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Вячэрні Камвуз. Заняткі Камвузу з 8 лютага—а 19 гадз.

Дом Асьветы. Заняткі вайсковага гуртка—а 19 гадз.

Дэкадны Камвуз. Чарговыя заняткі па ўсіх трох цыклях—а 18 гадз.

Клюб будаўнікоў. А 7 гадз. веч. адкрываецца 1-я Ўсебеларуская канфэрэнцыя фізкультурнікаў саюзу будаўнікоў.

Уваход на адчыненьне канфэрэнцыі па білетах, разасланых па рабачкомах.

10-га лютага ў памяшк. Акрана, пакоі 15, склікаецца папыр. нарада арганізатараў па ліквідзе і сакратароў т-ва «П. Н.» Пачатак—а 18 гадз.

10-га лютага, а 19 гадз. у залі пасяджэньняў ЦСПСБ адбудзецца **нарада брыгад па аглядзе каапэрацыі.** На нараду выклікаюцца брыгады з наступных прадпрыемстваў: «Чырвоны Тэкстыльшчык», п.-к. вяровачнікаў, п.-к. войлачнікаў, завод «Адраджэньне», «Дрэваапрацоўшчык», галянтарэйная і каўбасная ф-кі, разьніца, завод «Беларусь», фармазавод, «Чырвоны Хэмік», цагельны завод, сьпіртаводачны завод, палата мер і вагі, кахельны завод, універсытэцкі гаралок, Вадаканал, групком будаўнікоў № 2 і 7.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ЗЬВЯЗДА.

10-га лютага, а 7 гадз. увеч., у Доме камуністычнае асьветы адбудзецца

даклад тав. БУДЗІНСКАГА на тэму:

„ПРАВЫ ЎХІЛ У СЭКЦЫЯХ КАМІНТЭРНУ“

для партыйнага і камсамольскага актыву.

ПАСЬЛЯ ДАКЛАДУ МАСТАЦКАЯ ЧАСТКА.

Білеты па райкомам КП(б)Б, ЛКСМ і ў чытальні Дому.

12 лютага а 6 гадзіне ўвечары у залі пасяджэньняў ЦСПСБ (Дом Працы, 2-гі паверх)

ЦСПСБ СКЛІКАЕ

УСЕБЕЛАРУСКУЮ АРГАНІЗАЦЫЙНУЮ НАРАДУ

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ: Вынікі Ўсесаюзнай Арг'нарады і задачы рэарганізацыі праф. працы па БССР.

Бел. Бюро сэкцыі працаўнікоў друку разам з габінэтам журналістыкі пры Камвузе імя Леніна на 9-га лютага склікаюць

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ НАРАДУ

рабочых-вылучэнцаў, якія працуюць у рэдакцыях газэт і часопісяй.

З прычыны важнасьці пытаньняў просьба зьявіцца без спазьненьня. Нарада адбудзецца у памяшканьні рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» (рог Ленінскай і Карла Маркса).

Бел. бюро і габінэт журналістыкі.

БМІТ і Белар. Асацыяцыя НАП склікаюць на 8 лютага 1930 г. а 7 з палов. гадз. увечары ў памяшканьні НК РСІ (пакой № 3)

АГУЛЬНЫ СХОД ЧЛЕНАЎ АСАЦЫЯЦЫІ Н. А. П. І СЭКЦЫІ ІТС,

дзе будуць заслуханы даклады навуковых супрацоўнікаў Інстытуту Аховы Працы (т. т. **Дзіхцяра, Ранава, Малініна, Мунусевіча**) **НА ТЭМУ:** «Вопыт навуковага палыходу да пытаньня пераходу прадпрыемстваў на 7-мі гадз. рабочы дзень і бесперапынны рабочы тыдзень».

Запрашаюцца ўсе жадаючыя рацыяналізатары, рабочыя і служачыя.

ДОМ СПЭЦЫЯЛІСТЫХ СЕЛЬСКАЙ І ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ

СЁНЬНЯ, 8-га лютага ў залі Дому Селяніна адбудзецца чарговая

ЛЕКЦЫЯ ПАЛІТВУЗУ

На тэму:

«Асноўныя задачы саюзу Сельгаслесрабочых у сувязі з сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі»

Дакладчык **тав. Аснерка.**

Пачатак роўна а 6 гадзіне ўвечары.

Запрашаюцца члены саюзу Сельгаслесрабочых.

16-га лютага адбудзецца

ПЛЕНУМ САВЕТУ І ПРАЎЛЕНЬНЯ БЕЛАЗЕТ

Парадак дня:

1. Аб бліжэйшых задачах у справе землеўпарадкаваньня яўрэйскай працоўнай беднаты. Дакл. т. Рачыцкі.
2. Справаздача Прэзыдыуму Праўленьня Белазет. Дакл. т. Бунін.
3. Арганізацыйныя пытаньні.
4. Розное.

Ячэйка КП(б)Б, ЛКСМБ, мясцком і ўвесь калектыў работнікаў Дзярж. Яўрэйскага тэатру Беларусі з глыбокім жалем паведамляюць аб несвоячасовай сьмерці дырэктара тэатру—члена КП(б)Б

Грыгорыя Маркавіча РУБІНШТЭЙНА,

якая здарылася ў Маскве 7 лютага а 4 гадз. раніцы пасьля зацяжнай хваробы.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

ВЫШЛА з ДРУКУ І ПАСТУПІЛА ў ПРОДАЖ І. СЕРАДА—ПАБУДОВА СІЛОСАЎ у КАЛГАСАХ і САЎГАСАХ.

Стар. 52, цана 20 кап.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Звыш праграмы гастролі лепшых сатырыкаў **ГРОМАВА і МІЛІЧА**

З прычыны рэлікага посьпеху **2-гі** тыдзень мастацкі фільм **ГАЛУБЫ ЭКСПРЭС**

Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса ад 5 г.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ

Немецкі фільм вытворчасьці Уфа-фільм 1929 г.

2-гі тыдзень пастаноўкі ВІНАВАТЫ (судовая памылка)

У галоўн. ролі **БЭРНАРД ГЭТЦКЭ.**

Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 гадз.

КІНО ПРОЛЕТАРЫ

2-гі тыдзень 2-гі тыдзень

Новы амэрыканскі фільм.

МОАНА (СЫН ПАЎДНЁВЫХ МАРЭЙ).

у 7 част.

— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ — **кіно-хроніка Савкіно № 80**

Пачатак роўна а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР“

Мастацкі фільм **ПАЛОНЬНІКІ МОРА**

у 7 частках.

Звыш праграмы— навуковы фільм **КАЛМЫКІ** у 1 ч.

Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.

Каса адчынена ад 12 гадз. дня.

КІНО СПАРТАК

Выдатны мастацкі баявік **ВЯСЕЛАЯ КАНАРЭЙКА**

Пачатак 1-га сэансу—а 6 г. 30 м.

Каса—ад 5 гадз.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

І. Л. ПЭРЭЦ.

Субота, 8 лютага АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ **НА ЛАНЦУГУ ПАКУТЫ**

Драматычная паэма ў 2-х частках.

Білеты ў касе тэатру.

Пачатак роўна а 8 г. 30 м.

АНОНС! ПРЭМЬЕРА

„ДЖЫМ КУПЕРКОП“.

Запіс на мэтавыя спэктаклі прымаецца штодзенна ў канторы тэатру, тэл. 2-07.

АБВЕСТКА

ЧАСОПІСЬ

„Беларуская Работніца і Сялянка“

за СТУДЗЕНЬ месяц выходзіць з спазьненьнем па прычыне затрыманьня выпуску друкарняй.

Падпісчыкам разасланы 1-ы нумар, рассылаецца другі і гэтымі днямі будзе разасланы 3-ці нумар часопісі.

50 к. кошт публікацыі аб згубе дакумента

СКОРА у кіно-тэатры „КУЛЬТУРА“

мастацкі фільм

ТРАНСПАРТ АГНЮ

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты **„ЗЬВЯЗДА“** званоце па тэл.

2-49

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту **„ЗЬВЯЗДА“** званоце па тэл.

7-81

МЕНАКРСТРАХКАСА

на падставе пастановы ЦВК і СНК СССР ад 14-VII—29 г.

АБВЯШЧАЕ

з 10-га па 23-га лютага перарэгістрацыю наймацеляў хатніх працаўніц.

Парадак і тэрміны перарэгістрацыі ўстанаўліваюцца наступныя:

наймацелі, прозьвішча якіх пачынаюцца на літары		
А, В, Е і Ж	павінны зьявіцца	10 лютага.
Б	»	11 »
Г	»	12 »
Д, З і И	»	13 »
К	»	14 і 15 »
Л	»	16 лютага.
М і Н	»	17 »
О, П і Ц	»	18 »
Р і Ч	»	19 »
С	»	20 »
Т, У і Ф	»	21 »
Х і Ш	»	22 »
Ш, Ч, Э, Ю і Я	»	23 »

Пры перарэгістрацыі наймацелі павінны прад'явіць прафсаюзную або разліковую кніжку ад мейсца працы наймацеля і, па магчымасьці, квіток аб аплаце страхузносаў за апошні час. Наймацелі-саматужнікі павінны прад'явіць выбраны імі патэнт на 1930 г.

Перарэгістрацыя будзе вытварацца ў памяшканьні страхкассы, 3-ці паверх, ад 9 да 7 гадз. увечары.

УВАГА. Да перарэгістрацыі павінны зьявіцца таксама і тыя наймацелі хатніх працаўніц, якія да гэтага часу яшчэ не зарэгістраваліся у страхкасе.

Вінаватыя за ўхіленьні ад перарэгістрацыі будуць абкладзены штрафам у разьмеры да 100 руб.

МЕНАКРСТРАХКАСА.

Прыймо абвестак у нарговы нумар газэты ад 2 гадзіны дня

Прыкладная інструкцыя

Ўнутранога распарадку для сельска-гаспадарчых арцеляй БССР

ЗАЦЬВЕРДЖАНА ПРАЎЛЕНЬНЕМ БЕЛКАЛГАСЦЭНТРУ

I. Агульныя палажэньні

1. У пачатку апэрацыйнага году праўленьне арцелі з удзелам кіраўнікоў работ па асобных галінах гаспадаркі, пад кіраўніцтвам агранома, складае арганізацыйна-вытворчы плян на год.

У буйных арцелях з некалькімі дапаможнымі сядзібамі агульны арганізацыйна-вытворчы плян складаецца па галоўных мерапрыемствах у разрэзе кожнай дапаможнай сядзібы або населітчнага пункту.

2. Вытворчы плян гаспадаркі падаецца на абмеркаваньне агульнага сходу членаў арцелі, а ў буйных арцелях — на абмеркаваньне вытворчых нарад па асобных сядзібах і агульнага сходу ўпоўнаважаных арцелі і пасьля абмеркаваньня ўсіх пытаньняў вытворчасьці з унесенымі зьменамі і дадаткамі зацьвярджаецца.

3. Праўленьне арцелі ў сваёй працы на працягу ўсяго гаспадарчага году кіруецца гэтым арганізацыйна-вытворчым плянам. Копія вытворчага пляну павінна падавацца ў раёны або акруговы саюз калектыўных гаспадарак і адпаведную калгасэкцыю спэцыяльнага саюзу сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

4. Для выкананьня складзенага пляну праўленьне арцелі павінна пэрыядычна на вытворчых парадах членаў калектыўных гаспадарак разглядзець усе асноўныя мерапрыемствы, якія зазначаны ў пляне, і прымаць усе меры да іх выкананьня.

5. Для сваячасовае падрыхтоўкі арцелі да веснавое і асеньняе сяўбы, праўленьне арцелі складае, апрача арганізацыйна-вытворчага пляну, плян па правядзеньні веснавое засеўнае кампаніі ў студзені і асеньняе засеўнае кампаніі ў ліпені месяцы. У пляны павінны быць таксама ўнесены пытаньні агранамічнага абслугоўваньня і дапамогі з боку арцелі навуковым бядняцка-серадняцкім гаспадаркам.

6. У калгасах, якія маюць звыш 200 членаў, агульны сход членаў замяняецца сходам упоўнаважаных, якія выбіраюцца тэрмінам на 1 год на агульных сходах асобных гаспадарак, з разліку адзін упоўнаважаны ад кожных 5—25 членаў, у залежнасьці ад агульнага ліку членаў арцелі. Нормы гэтых устанаўліваюцца раённым або акруговым калгасаюзам.

Агульны сход членаў або сход упоўнаважаных арцелі склікаецца ня менш 3-х раз у год для разгляду і зацьвярджэньня гадавое справаздачы за мінулы год і вытворчага пляну на наступны, а таксама для разгляду і зацьвярджэньня пляну асеньняй і веснавой засеўнай кампаніі.

II. Правы і абавязкі членаў арцелі

1. Кожны член арцелі як той, што раней уступіў, так і той, што ўступае ў члены арцелі, дае падпіску па вызначанай форме аб тым, што ён будзе падпарадкавацца статуту арцелі, інструкцыі ўнутранога парадку і пастановам агульнага сходу або сходу ўпоўнаважаных арцелі.

2. Член арцелі, які выходзіць з яе, ня мае ніякага права на атрыманьне непадзельных капіталаў, якія складаюцца з дзяржаўнае маемасьці, штогадовых адлічэньняў ад прыбыткаў гаспадаркі, з прэмій, атрыманых гаспадаркай, і ўступных узносаў. Выключаны член арцелі, ці той, хто выходзіць па сваёй волі, атрымлівае разьлік, як паказвае адпаведны разьдзел статуту.

3. Члены арцелі, прызваныя ў Чырвоную армію, вучні, а таксама выбраныя і адкамандураваныя на савецкую, партыйную і прафсаюзную працу, ня лічацца выбылымі з арцелі, а лічацца членамі арцелі па працягу тэрміну, устаноўленага агульным сходам або сходам упоўнаважаных арцелі.

4. Калі член арцелі заўважыць няправільныя ўчынкі з боку праўленьня, дык падае аб гэтым заяву ў рэвізійную камісію, якая разглядае пытаньне і стаўіць яго на вырашэньне агульнага сходу. У тым выпадку, калі член ня згодзен з дзейнасьцю праўленьня ў справе разьмеркаваньня рабочай сілы і г. д., то ён можа падаць скаргу агульнаму сходу, але ні ў якім разе ня мае права самавольна парушаць загад савету або іншых, упоўнаважаных на гэта асоб.

5. Кіруе гаспадаркай арцелі праўленьне. У асноўным яно праводзіць кіраўніцтва праз вылучанага ім старшыню. Як правіла, старшыня павінен выконваць фізычную работу роўна з іншымі членамі арцелі, але, залежна ад яго нагрузкі, як старшыні, можа быць часткова, а ў буйных арцелях зусім вызвалены ад фізычнай працы. Старшыня праўленьня цалкам адказвае за стан усіх галін гаспадаркі, стан падліку і справаздачнасьці, за выкананьне вытворчага пляну, сваячасны зварот крэдытаў, а таксама за падачу сваячасовых вестак вышэйшым калгасным і каапэрацыйным аб'яднаньням, членам якіх арцель зьяўляецца.

6. Рахункаводства, справаводства і ўсю перапіску арцелі вядзе спэцыяльная асоба, вылучаная з членаў арцелі, ці нанятая з боку.

7. Скарбнік загадвае ўсімі грашовымі сумамі, вядзе касавую кнігу, прымае і захоўвае розныя цэннасьці, узносы і выплаты і па пісьмовану дазволу старшыні робіць выплату па выдатках гаспадаркі арцелі. Скарбнік выбіраецца са складу членаў праўленьня ці членаў арцелі на агульным сходзе.

8. Кіраўніцтва гаспадаркай і працай праўленьне ажыцьцяўляе праз вылучаных ім старшыню і кіраўнікоў асобных галін гаспадаркі. У буйных арцелях у дапамогу праўленьню запрашаецца загадчык гаспадаркай і загадчыкі дапаможных гаспадарак.

III. Парадак разьмеркаваньня рабочае сілы

1. Для стварэньня большай спэцыялізацыі і навыку ў працы членаў па асобных галінах гаспадаркі ўсе працоўныя члены арцелі разьмяркоўваюцца ў асобныя спэцыяльныя групы па галінах гаспадаркі. Разьмер кожнай спэцыяльнай групы вызначаецца патрэбнасьцю ў працоўнай сіле тэй або іншай галіны гаспадаркі.

2. У буйных арцелях з некалькімі дапаможнымі сядзібамі і буйнымі прадпрыемствамі ўся рабочая сіла адначасова разьмяркоўваецца і па асобных дапаможных гаспадарках або населітчных пунктах і буйных прадпрыемствах, прыстасоўваючыся да пастаяннага месца жыхарства членаў.

Увага: Для роўнамернага разьмеркаваньня рабочай сілы і асабліва кваліфікаванай сілы па дапаможных гаспадарках у паасобных выпадках утвараецца перасяленьне членаў.

3. Кожная спэцыяльная група ў буйных арцелях складаецца ў спэцыяльныя рабочыя брыгады па спэцыяльных частках кожнай асноўнай галіны гаспадаркі. Напрыклад, група па жывёлагадоўлі складае рабочыя брыгады па буйной рагатай жывёле, сьвінагадоўлі, птушніцтве, група па паляводзтве складае рабочыя брыгады па асобных культурах і г. д. Разьмер кожнай рабочай брыгады таксама вызначаецца патрэбнасьцю ў рабочай сіле тэй спэцыяльнай часткі гаспадаркі, для якое яна прызначаецца.

4. У адпаведнасьці з вызначанымі спэцыяльнымі групамі па асноўных галінах гаспадаркі вызначаюцца праўленьнем і адпаведныя адказныя кіраўнікі гэтых спэцыяльных галін гаспадаркі. На чале кожнай брыгады прызначаецца старшы брыгадзір. Брыгадзіры, а ў дробных арцелях і кіраўнікі паасобных спэцыяльных галін гаспадаркі выконваюць фізычную працу нараўні з іншымі членамі арцелі. У буйных-жа арцелях кіраўнікі паасобных спэцыяльных галін гаспадаркі па пастанове агульнага сходу ці поўнасьцю вызваляцца ад выкананьня фізычнай працы ў гаспадарцы.

5. Вылучаюцца кіраўнікі па наступных галінах гаспадаркі:

а) паляводзтва — яго абавязак — весьці падлік і разьмяркоўваць рабочую сілу, кіраваць і назіраць за працай у полі, назіраць, каб у свой час абрабляліся палі і зьбіраўся ўраджай з поля і сенажаці і падлічваць увесь ураджай;

б) жывёлавод, абавязкі якога — падлік жывёлы і прыплоду, нагляд з правільным утрыманьнем, гадоўляй і кармленьнем жывёлы, нагляд за сваячасовым і правільным даеньнем кароў, падлік кантрольных удояў малака, улзел у куплі жывёлы і бракаваньні статка, а таксама падлік рабочых дзён, якія патрачаны на гадоўлю жывёлы;

в) канюх — загадвае рабочай жывёлай, сам наглядае, каб жывёла ў пару і правільна была дагледжана (паеньне, кармленьне, чыстка і г. д.), а таксама наглядае за збруяй і транспартам, які знаходзіцца пад яго ведамам;

г) садоўнік-гароднік — вылучаецца ў тых арцелях, дзе ёсьць значная плошча саду і дзе гароднічтва мае таварны характар. Ён наглядае за правільным вырабам саду і гароду, за правільным доглядам, аборам ураджаю, зьнішчэньнем шкоднікаў саду і гароду;

д) загадчык сьвірнам — у буйных калектыўных гаспадарках загадвае прыёмам і выдаваньнем прадуктаў і магар'ялаў, наглядае за інвэнтаром і будынкамі гаспадаркі, а ў дробных арцелях, у пэўныя гадзіны дня, прымае і выдае прадукты, пасьля чаго выконвае іншую спэцыяльную працу;

е) у арцелях, дзе ёсьць тэхнічныя прадпрыемствы: крухмальны завод, млын, маслабойна-сыраварны завод і г. д. вылучаюцца адпаведныя спэцыялістыя-майстры, якія вядуць працу, падлік і за пастаноўку справы тэхнічнага прадпрыемства адказваюць перад праўленьнем;

ж) у кожнай арцелі павінен быць на сялібе начны вартаўнік, які, апрача варты, мае яшчэ пасільную нагрузку якою-небудзь дробнаю работаю. Вартаўнік адказвае за цэласьць усёй маемасьці;

з) у арцелях, дзе ёсьць трактарныя калёны, вылучаюцца ў якасьці кіраўнікоў і адпаведныя спэцыялістыя-мэханікі, якія адказваюць перад саветам арцелі за працу трактарных калён, вядуць падлік працы трактараў і прычэпнага інвэнтару, сочаць за спраўнасьцю трактараў і прычэпных прылад да іх і ўтварэньнем сваячасовага іх рамонту, вядуць падлік гаручага і змазачнага матар'ялу;

і) у буйных арцелях абавязкова вызначаецца адказны кіраўнік усёй машына-коннай сілай арцелі, які асабіста адказвае перад праўленьнем за рацыянальнае скарыстаньне машын і рабочай жывёлы арцелі, складае штомесячны плян скарыстаньня машына-коннай сілы, клапоціцца аб поўнай нагрузцы пягавай сілы на працягу ўсяго году і праводзіць разьмеркаваньне машына-коннай сілы ў гаспадарцы.

6. Усе члены арцелі ці адпаведныя брыгады павінны падпарадкавацца кіраўніку тэй галіны гаспадаркі, у якой яны працуюць, на ўвесь час работы.

7. Кіраўнікі адказны перад старшынёй праўленьня за штодзенную апэрацыйную працу і даюць яму справаздачу.

8. Для больш роўнамернага і мэтазгоднага разьмеркаваньня працы паміж усімі членамі арцелі, у пачатку кожнага году праўленьне арцелі разьмяркоўвае колькасьць рабочых дзён, што вызначаюцца арганізацыйна-вытворчым плянам гаспадаркі, паміж паасобнымі членамі арцелі па колькасьці працаздольных адзінак, улічваючы пры гэтым і працу падросткаў у пераводзе на дарослых. Разьмеркаваньне гэтае падаецца на абмеркаваньне агульнага сходу або сходу ўпоўнаважаных у буйных арцелях і пасьля іх зацьвярджэньня зьяўляецца абавязковым мінімальным працоўным заданьнем на год для кожнага члена.

Увага: Пры пераводзе падросткаў у дарослыя прымаюцца хлопчыкі і дзяўчынкі ад 12-ці да 16-ці год за 0,7 працоўнай адзінкі.

IV. Праца

1. У пачатку кожнага месяца праўленьне арцелі сумесна з кіраўнікамі паасобных галін гаспадаркі складае плян працы на наступны месяц па розных галінах гаспадаркі. На падставе штомесячнага пляну такім-жа парадкам складаецца каляндарны плян працы на кожны тыдзень, з паказаньнем, хто якую працу і дзе будзе выконваць. Тыднёвы плян працы вывешваецца за дзень да пачатку тыдню на відным месцы ў кожным паселітчным пункце арцелі.

2. Розныя адлучкі з арцелі ў рабочы час дазваляе старшыня праўленьня ці упоўнаважаная на гэта асоба. Час адлучкі выключаецца з часу рабочага дня. Самавольныя адлучкі або спазьненьні на работу падлічвае кіраўнік групы. За відавочна нясумленную работу, псаваньне інвэнтару і г. д. накладаецца кара па асобных правілах, апрацованых саветам арцелі і зацьверджаных агульным сходам.

3. Усе сельска-гаспадарчыя машыны і прылады, збруя, а таксама і рабочыя коні, для больш правільнага іх выкарыстаньня і дагляду ў часе сэзонных работ, прымацоўваюцца да пэўных груп або асоб, якія і адказваюць за атрыманы імі жывы і мёртвы інвэнтар.

4. Для лепшай спэцыялізацыі і кваліфікацыі, стварэньня пэўных навыкаў у працы членаў і павышэньня адказнасьці кожнага працаўніка за выконваемую працу ўтвораныя спэцыяльныя групы і брыгады, рабочыя і паасобныя ўдзельнікі замацоўваюцца на сталую працу па спэцыяльнасьці. Скарыстаньне іх на іншай працы дапушчаецца толькі пры адсутнасьці працы па спэцыяльнасьці.

5. Жанчыны-адзіночкі (старэйшыя ў сям'і, удовы) пры разьмеркаваньні работ узімку, калі няма поўнай нагрузкі для жаночых рабочых рук, павінны атрымліваць колькасьць работы роўна з мужчынамі.

6. Усім падросткам даецца праца па іх сіле на падставе асобных правіл, распрацаваных саветам і зацьверджаных агульным сходам або сходам упоўнаважаных арцелі. Для ўтварэньня кадраў спэцыялістых трэба прымацоўваць падросткаў (браніваць) да спэцыялістых арцелі (масларо, сыравар, мэханік, каваль, садоўнік і г. д.). Праўленьне арцелі павінна ўстанавіць пэўны тэрмін для навучаньня гэтых падросткаў.

7. На кожны пэрыяд году (вясна, лета, восень і зіма) у залежнасьці ад характару работ у кожным пэрыядзе, савет арцелі вызначае даўжыню рабочага дня. Пэўныя гадзіны выхаду на працу і адпачынку і падае на разгляд і зацьвярджэньне агульнага сходу або сходу ўпоўнаважаных, пасьля чаго ўстаноўлены распарадак дня зьяўляецца абавязковым для выкананьня ўсіх працаўнікоў арцелі.

8. У мэтах найбольш поўнай нагрузкі існуючых у гаспадарцы складаных машын, скарыстаньня кваліфікаванай працоўнай сілы для іх ўстанаўліваецца праца ў 2-3 зьмены ў залежнасьці ад наяўнасьці і тэрміновасьці работы ў тым або іншым пэрыядзе году.

9. Кіруючыся прыкладнымі нормамі выпрацоўкі для калгасаў або нормамі выпрацоўкі бліжэйшага саўгасу, савет арцелі распрацоўвае на кожны год нормы выпрацоўкі па розных галінах і працах гаспадаркі, прыстасоўна да ўмоў цьвярджэньне агульнага сходу або сходу ўпоўнаважаных арцелі. Пасьля разгляду і зацьвярджэньня норм выпрацоўкі агульным сходам або сходам упоўнаважаных яны зьяўляюцца абавязковымі для выкананьня ўсімі членамі.

Увага: Пры распрацоўцы норм трэба выходзіць з 8-мігадзіннага рабочага дня.

V. Ахова працы

1. Мэдычная і акупэрская дапамога даецца членам арцелі і іх сем'ям за кошт арцелі, дзеля чаго ў арцелях павінны быць створаны спэцыяльныя фонды страхаваньня. Гэтыя фонды складаюцца з штогадовых адлічэньняў ад прыбыткаў членаў арцелі або за кошт апэрацыйных выдаткаў. Прыкладнае палажэньне аб гэтых фондах апрацоўвае праўленьне і зацьвярджае агульны сход або сход упоўнаважаных. За гэтыя-ж сродкі набываюцца патрэбныя мэдыкаменты (аптэчкі).

2. Для аказаньня першай мэдычнай дапамогі членам арцелі абавязкова набываецца невялічкая аптэчка. У буйных арцелях аптэчкі павінны быць у кожнай дапаможнай сядзібе.

3. Пяжарным жанчынам даецца водпуск — 4 тыдні да родаў і 4 тыдні пасьля родаў. За гэты час ім выдаецца штомесячная аплата на аснове сярэдняга гадавога заработку.

4. Дзеці да 12-ці год і вучні на час вучобы зусім вызваляюцца ад работы.

5. Усе члены арцелі, вызваленыя ад работы з прычыны хваробы, атрымліваюць аплату на аснове правіл, апрацаваных саветам і зацьверджаных агульным сходам, прычым фурманку да доктара дае арцель.

Увага: Для вызваленьня ад працы па тэрмін звыш 1-го дня з прычыны хваробы неабходна падача адпаведнай даведкі ад бліжэйшай лекавай установы.

6. Кожнаму члену арцелі ў працягу году даецца 2-х тыднёвы адпачынак. Адпачынкі даюцца членам па чарзе на працягу ўсяго году. Парадак і чарганьне адпачынкаў устанаўляе праўленьне і падае на абмеркаваньне і зацьвярджэньне агульнага сходу або сходу ўпаўнаважаных арцелі ў пачатку кожнага году. Час 2-хтыднёвага адпачынку аплачваецца па сярэднім гадовым заработку гэтага члена. 2-хтыднёвы адпачынак даецца не раней, як пасьля гадавое працы ў арцелі.

7. Адзін раз у тыдзень кожнаму члену арцелі даецца і выхадны дзень для адпачынку. Пры нескарыстаньні чарговага дня адпачынку апошні па ўзгадненьні з праўленьнем даецца ў наступныя выхадныя дні. Пры пераходзе арцелі на бесьперапынны рабочы тыдзень выхадныя дні даюцца на агульных падставах, прадугледжаных у палажэньні аб бесьперапынным рабочым тыдні.

8. Для вартаўнікоў, пастухоў, асоб, якія працуюць па трактарах і складаных машынах, тэхнічных прадпрыемствах і іншых адпаведных працах, даецца за рахунак агульных сродкаў арцелі спэцвопратка. Сьпіс асоб, якія маюць права на атрыманьне спэцвопраткі, складаецца праўленьнем і зацьвярджаецца агульным сходам або сходам упоўнаважаных арцелі.

VI. Падлік працы

1. У арцелі вядзецца ў абавязковым парадку падлік працы усіх рабочых дзён членаў арцелі. Усякая работа ці гэта падзённая, ці па заданьні або зьдельная, павінна быць поўнасьцю падлічана па асобных формах журналу работ.

2. Для падліку работы кіраўнік гаспадаркай і загадчык паасобных частак гаспадаркі запісвае ў ведамасьць ці табэль вестак аб зробленай членамі арцелі рабоце.

3. У табэль работ запісваецца: а) кім работа зроблена; б) колькі дзён або гадзін патрачана на работу; в) які інвэнтар быў выкарыстаны на рабоце; г) якая работа (ворыва, касьба і інш.) была зроблена; д) норма заданьня і яго выкананьне. Табэль, падпісаны ўкладальнікам яго, перадаецца рахункаводу для складаньня справаздачнасьці. Рахункавод, атрымаўшы весткі, павінен унесьці іх у рабочы табэль. Табэль работ пасьля кожнага месяца вывешваецца на ўмоўленым месцы і, калі на працягу трох дзён не падаюцца скаргі з боку членаў арцелі, то лічыцца, што табэль укладзены правільна і лік рабочых дзён кожнага члена арцелі ўпісваецца ў яго асабовы рахунак і ў яго разліковую кніжку. Можна таксама прачытаць табэль на агульным сходзе членаў арцелі штомесячна.

(Канец заўтра).

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.

Менск, Галоўлітбел № 337.